Ілона Сцяцко



# Нябёсныя карункі



*Жыццё рухаецца — няспынна, няўмольна; развіваецца ад простага да складанага і ад складанага да простага.*

*Усё паўтараецца. Свет калапсуе да кропкі самога сябе і выходзіць на іншы ўзровень.*

*Усё ўзаемазвязана і згарманізавана. Як будзённасць — так і летуценнасць. Рэчаіснасць (не заўсёды прыемную, удзячную) трэба ўраўнаважваць чароўным і светлым, толькі тады будзе магчымы прарыў з кола фатальных наканаванняў і ўсюдыіснай прадвызначанасці да спазнання сутнасці быцця.*

*Ілона Сцяцко*



Ілона СЦЯЦКО

# Нябёсныя Карункі

Кніга вершаў

Мінск
2000

Сцяцко І.М.

Нябёсныя Карункі. Вершы.

Ілона Сцяцко нарадзілася ў 1976 годзе ў Тбілісі. Вершы пачала пісаць падчас вучобы ў школе, калі бацькі вярнуліся на сваю радзіму, у Беларусь, і юная паэтка жыла ў Ваўкавыску. Як і ўсе дзеці вайскоўцаў, была вызвалена ад вывучэння роднай мовы. Але, будучы навучэнкай Мінскага фінансава-эканамічнага каледжа, адчула, што душа прагне менавіта беларускага слова, што яе беларускамоўныя вершы атрымліваюцца больш шчырыя і мілагучныя...

І гэта сапраўды так. Светлае неба душы паэткі зорыцца мноствам зямных сонцаў, што спеляць у росных лугах ды блакіце азёраў і рэк высокае пачуццё любові да сваёй Бацькаўшчыны.

Жыве І. Сцяцко ў Мінску, працуе бухгалтарам і завочна вучыцца ў БДУ на філасофска-эканамічным факультэце. Яе першы паэтычны зборнік «Галінка язміну» быў змешчаны на старонках часопіса «Першацвет» у 1997 годзе (№ 9).

© Аўтар І. Сцяцко, 1999
© Мастак У. Панкевіч,1999

## АВЕН



*Можа, дух я вясны агнявой,*
*а мой вобраз — адкрыты і смелы:*
*хто пазбегнуў сустрэчы са мной —*
*у жыцці той пакуль яшчэ цэлы...*

## АГОНЬ — ДЗЕЛЯ АГНЮ...

* * *

Агонь — дзеля агню!
Агонь — дзеля жыцця!
Агонь — дзеля таго,
каб распачаўся свет...
Напружаным крылом
працяўшы вышыню,
злучаецца з вясной
над сеткаю планет.
Ён — моц, стыхія, гнеў!
Ён — вой, віхор... Ён — спеў!
Гарыць, стварае, мрэ...
Ён — святасць, ён — і грэх.
Ён — хуткасць далячынь.
Ён — полымя, ён — плынь...
Агонь — дзеля агню!

* * *

Кот мой расцягнуўся на стале пісьмовым,
кніжку гараскопаў падцягнуў пад голаў.
Паўраскрытым вокам сочыць ён за снамі,
а зіма па вокнах сочыць за катамі...

* * *

Тушыць агні веснавая дарога!
Веліч і свята бадзёрага ранку.
Дрэвы, свабодныя ў замшавых тогах,
выйшлі насустрач світанку.

Вые паветра сцюдзёнай парой.
Просяцца рукі схавацца ў кішэні.
Холад бярэ і ўзнімае настрой
разам на ўсе запрашэнні.

Зімна, бы ў лютым. Зялёная здань —
гэта вясновая панна-кабета.
Гэй, красавік, ты з кішэні дастань
хоць бы кавалачак лета!

* * *

Маланка і жорсткая праўда —
родныя мне:
успыхнуць пажарам —
і быць вайне.

Заходзяцца фарбы —
нябёсны жах...
Нясецца нястрымны
чырвоны птах!

Стыхія, стыхія!
Vivat жа ёй!
Агонь і бляск —
заўсёды са мной!

І поўня свеціць.
І месяц — у ёй.
І сонца квецень
ліхтарных мрой!

* * *

Круціцца ў дрэвах патлатых поўня,
цемра лунае над горадам сонным,
дзікія зоры — начныя штрыхі —
рвуць цішыню, як штандары — штыхі.

Лье навальніца крывавыя слёзы —
вобраз агню з навальнічнага мозгу
рве на кавалкі маланкамі свет...
І скаланаецца пояс планет.

Гора ці шчасця блакітнага грому,
Бога ці чорта, а мне — не вядома.
Месца змянілі кароль і ладдзя.
Я ж — сумны воін, — не цар, не суддзя.

* * *

На світанні далёкім цудадзейнае слова
заплялося з раслінай душы каранямі,
дзе жывая замова злучае вытокі
рэчаіснасці ведаў з агнямі.

* * *

Гэй, мая адважная сяброўка!
На кані ляціш наперагонкі...
Стрэлам пераносіць чыстакроўка
праз ручво царыцу-амазонку.

Капытамі хвошча кабыліца,
пыл ляціць з-пад залатой падковы.

Узнімае лёгкі лук царыца —
накрывае стрэламі галовы.

Спапяляе вогненныя гронкі
кроў з мячэй, шаломавыя спевы...
Перамогу славяць амазонкі —
хуткія, праслаўленыя дзевы.

* * *

Напіўшыся праўды крынічнай,
вясны і вясновай свабоды —
да шчасця наступнага года
выходзіць анёл ваяўнічы.

Віншуе квяточнае войска,
сыходзіць без жалю і фарсу
па велічным вогнішчы Марса,
вясновую скончыўшы бойку.

Сцвярджаючы сонечным маршам
авенаў трыумф-перамогу,
агнём адкрывае дарогу
юнацтву, свабодзе, бясстрашшу!

* * *

Ёсць стыхія вакол мяне,
унутры ёсць маёй істоты...
Палыхае-гарыць, заве —
згінуць каб і ўваскрэснуць потым.

Спасцігае, губляе зноў —
попел кідае дрэвам пад ногі.
Закіпае душа і кроў...
Мы цяпер — агнявыя богі!

# КАХАННЕ САЛАМАНДРЫ

За што люблю  істоту
стыхіі не сваёй?..
Аб гэтым мару ўпотай
ля схову пад зямлёй.

Садзіцца сонца ў небе,
і я гару пад ім
агеньчыкам на глебе
іскрыста-залатым.

Ён — уладар паветра,
а я — служу агню
і ў патаемных нетрах
хаваю цеплыню.

У лесе на паляне
чакаю цэлы дзень,
калі ж сюды загляне
лятучы карабель.

Ну — вось і ён! Мы разам
шчаслівыя, бы ў сне...
Стыхійныя наказы
каханне абміне.

Ды што стыхій нам воля,
паветра і агню —

па сонечным раздоллі
ляцім у вышыню!

* * *

У вандроўку збіраюся сёння,
каб на схіле мінулага дня
ўплесці месяца бледныя промні
ў сваё сэрца... А ў ночы ўжо я,
не зрабіўшы ніводнага кроку,
апынуся ў далечы такой,
што мяне ані людзям, ні Богу
нельга будзе пабачыць у ёй...
Адпачыўшы ў глыбінях дзівосных,
я вярнуся шчасліва назад
у прыволле сцяжынаў росных,
да штодзённых пакутаў і страт.

## ДЗІЦЯ РАЎНАВАГІ

### *1*

Адкрыць ці пахаваць
мой гук, імя, натхненне,
пакінуць слаўны крыж,
што ведаю — забыць.

Ці, можа, запыніць
празрыстае імгненне
і легкадумным сном
мой свет перарабіць.

Чаму марнею я
падчас вясны свавольнай?
Чаму спакон вякоў
трапляю зноў сюды?

Гаротная зямля
надзеі паднявольнай,

паходы чужакоў
і чорныя сляды...

Чаму, чаму, чаму?..
Зачынены старонкі.
Кавалкі ўсіх прычын
ад выбуху ляцяць,

а вінаваты ў тым —
запалкі са скарбонкі:
іх запаліла зноў
пакутнае дзіця.

***2***

Бывай, пакутнае дзіця!
Тваю душу заклала я
паміж старонак светлай кнігі.
Перапляценне двух агнёў —
у свет халодных камянёў
нясі чакальны міг адлігі.

* * *

І смерць, бывае, побач ходзіць,
каля агню сядзіць з касой.
Глядзіць скрозь полымя... Ды годзе
мне болей гаварыць аб ёй.

Яна прыйшла. Стаіць ля свечкі,
каб чыйсьці ўсмерціць шлях зямны
слязой журботнаю знявечыць...
І вось — мы з ёй зусім адны.

Я — ад людзей. Яна — ад Бога.
Я — на зямлі, яна — наўкол.

Маўчу... Яна ў адказ — нічога..
Гарачы воск цячэ на стол.

Халодным позіркам на свечкі
глядзіць учорнена, як здань.
І зрэнкі — спелыя парэчкі —
свідруюць роспачы адхлань.

Агонь і смерць, вада і сутнасць,
зямля, жыццё, паветра, шлях...
Я адчуваю крок пакутны —
хто там ідзе: Яна ці Я?

## ГАДЗІНА

Дваццаць сёмая, варожая...
Крок засмучаны да святла.
З той падзеі, што народжана
на пабітай зорцы шкла.

Сцежак ёй няма няходжаных —
свет сышоўся ў горкі клін.
Дваццаць сёмая, варожая —
чорны шлях для ўсіх гадзін.

* * *

Гонар не страчу, кароны не дам,
вораг.
Я кіну з ёй на каменны дыван
гора.
Памятай, згінуў апошні кароль.

Я нескароны!
Хай разбіваецца разам са мной
жэмчуг з кароны.
Згоды не будзе, сумленню майму —
смерць дапаможа!
Літасць, мой вораг, пакінь таму,
хто пераможа.

* * *

Я з мовы здымаю праклёны
і слаўлю адданых дзяцей,
радзімай сваёй акрылёных
на аброну яе.

Няхай і ў часы ліхалецця
плынню святарнай ракі
родная мова ліецца —
змые людскія грахі.

Слаўлю — і чую, і бачу,
што праз часіны імглы
скончацца боль і нястачы,
вернецца гонар былы!

* * *

Калі адбіраюць надзею маю,
не плачу я болей,
бо ведаю:
з крыніцы, не збуджанай
сённяшнім болем,
святую ваду першароднасці п‘ю.

* * *

Чуллівым словам цешыцца паветра.
Было мне добра, а цяпер — не веру
пужліваму, замёрламу балету
неверагодна-казачных містэрый.

Жыццё — даволі простая складанасць.
І хараство, не звязанае з цудам,
яму здаецца рэччу дасканалай,
якую вечнасць памяншае брудам.

А мне ўсё роўна — двухбаковай фарбы
быць не павінна па маіх законах.
А хтосьці — не жадае жыць без праўды,
спрачаецца з няпраўдаю да скону.

* * *

Я не хачу жыцця зямнога
і паўсядзённай мітусні.
Адной хвіліны мне замнога,
каб зажурыцца ад хлусні.

На скрыжаваннях чэрці брэшуць —
усё ж на свеце праўда ёсць!
Яна душу мне грэе вершам,
а я — душу ў кішэнях злосць.

* * *

Ціхая вада па кропельцы сыходзіць.
Кропляў чарада ў старажытным годзе.
Там няма вакол ні душы — заціхша.
Не хапае слоў спавядацца цішы.

На руцэ маёй — круцяцца стагоддзі.
Кропелькай-слязой немата сыходзіць.
Хутка ўжо скажу чулае прызнанне
дробнаму дажджу аб вялікай тайне.

Зведаўшы паток сонечнай стыхіі,
я знайшла выток праз шляхі крывыя,
і цяпер са мной — вечная дарога
з новай дабрынёй ля агню старога.

* * *

Нуда, вясновая нуда.
Квітнее сад у прыгажосці,
а мне чагосьці так шкада...
І не хапае мне чагосьці.

Пяшчотай дыхае вясна,
а я — не ведаю кахання.
Чаму цяпер іду адна?..
Пытанне, горкае пытанне.

Лісцё зялёнае вакол,
раса на лапінах іскрыцца,
і светла-зорны арэол
хавае срэбную царыцу.

Аддаўшы росквіту нуду,
я зноў па велічнай алеі
у срэбным полымі іду,
і на душы маёй святлее.

* * *

А на небе — сонейка
свеціць-ззяе роўненька,
свеціць слаўна-ветліва,
ветлівай парой!
Пад касымі промнямі
я танцую полечку,
пляскаю ў далоні —
радасны настрой!

* * *

Я зорку вынайду —
і назаву Ілонай.
Не ў гонар — так,
няхай сабе гарыць...
За кіламетраў
дзесь мільён-мільёнаў,
у поўневай — ці нейкай там — зары.
Паслухайце!
Як слаўна і — як дзёрзка,
задраўшы голаў,
уначы ідзеш.
А з вышыні —
падміргвае мне цёзка:
— Уніз глядзі!..
Бо раптам упадзеш.

## ІМГНЕННЕ

Раніцою гляджу ў акно...
Што ж я сёння дзівоснага бачу?
Анічога. Усё — як было.
Толькі ўсё ж такі крышку іначай.

Так, інакш, чым было тут раней —
міг не можа ізноў паўтарыцца.
Я пішу пра імгненне цяпер,
а яно ўжо кудысьці імчыцца.

Так, зусім не прыкметна яно,
але ў памяці я захаваю —
хай цяпер, хай хоць гэта адно:
вось пішу, а пасля прачытаю.

* * *

Ты ведаеш,
мае палаюць грані —
ва ўсе бакі сваё снуюць
праменне!
Праз іх мне будзе
доўгае выгнанне
за свечку згаслую
майго натхнення.
За тое, што вузлом
звязала словы,
у лічбавай труне
іх пахавала,
прыдумала
бязглуздыя высновы —
з‘іначыла і сшыла...
Памяняла

свой шлях малы —
на нейкае зацьменне.
Вакол хаджу і думаю:
бывае
праз лёс бацькоў
такое паўтарэнне.
А што, мой сябра-лёс,
цяпер параіш?..
У маці — талент быў,
дык — відавочна:
я запісы яе чытала,
сшыткі,
што на паліцах
паміраюць моўчкі —
мінулай думкі
залатыя зліткі...
Вось чыркаюць гады,
нібы запалкі
на тое на нябёсах
хтось паклаў...
Не скончаны на мне,
як быццам, цалкам
той матчын
слова-вобразны запал!

* * *

Мама, дзіця я тваё неласкавае.
Мама, прабач мне замкнёнасць маю.
Мама, давай пагаворым за каваю —
проста скажу, што цябе я люблю.

Ведаеш, сэрцам глыбока затоены
вобраз, што памяць хавае глыбей...
Мама, я помню цябе маладою
і падабенства шукаю ў сабе.

Як ты мяне разумееш заўсёды —
з кожнай хвілінай мацней і мацней
я адчуваю падтрымку і згоду,
ведаю: думаеш ты пра мяне.

Мама, дзіця я тваё неласкавае.
Мама, прабач мне замкнёнасць маю.
Мама, давай пагаворым за каваю —
проста скажу, што цябе я люблю.

* * *

У кожным свеце маю прытулак —
ці адна, ці засну на дарозе.
Завярну на знаёмы завулак,
пазваню на знаёмым парозе.

І адчыняцца дзверы нячутна —
апынуся ў адзіным пакоі.
Адаб'юся ў блакітным люстры,
што ўздымала з падлогі да столі.

Азірнуся — і ўбачу, можа,
два знаёмыя крэслы і ложак,
на якім я, пакінуўшы зброю,
размаўляю аб нечым з сабою.

* * *

У свеце іх няма нідзе.
А па-за светам, па-за светам —
там пустата. Няма людзей.
Няма жывёл, раслінаў, кветак.

Хто там знямеў — у цемнаце?
Якім жыццём працяты нетры?
Не бачу — іх няма нідзе.
І нават тут, за гранню света.
Ні каля кропкі. Ні вакол.
Ні ў ёй самой...
— Дык дзе ж, скажыце?
— Яны ў зямлю загналі кол
на іншай хвалі Перажыці.
— А што такое Перажыць:
пачвара, дэман ці хімера?
— Яна — наш час, які бяжыць
без нараканняў і намераў.
Усё запісана ў вяках:
калі яе кавалкі скласці,
то можна свет перапісаць
і перабблытаць боль і шчасце.
— Не разумею, раскажы...
Дык я ў якім жыву памеры?
— На варыянтавай мяжы
адной зямлі ставокай сферы.
— Удакладні: калі памру,
мае шляхі дабра і зла
па кругавому палатну
сыдуць іголкай без вузла?
— Праз безлічона многа будзен
твой шлях скіруецца ўгару —
тады ўжо ты сабой не будзеш...
— Дык што — у пекле я згару?..
То за які такі ўжо грэх?
— Няма грахоў у праўды словах:
ты — пойдзеш чысцінёй уверх.
Я ж — у зямлю... Адначасова.

* * *

Мой анёлак агню,
так мяне пакараць!
Крылы думкам
маім спаліць!..

Калі будзеш далёка
адзін паміраць —
сэрца маё забаліць
і застыне сляза
на высокай сасне,
і зацягнецца зорны пасеў;
і калі я па зёлкі
пайду па вясне —
я ў вятрыску пачую твой спеў.

Будзе сум сярод кветак,
як чорны павук,
ткаць жалобную сетку,
уплятаючы гук...
І — з атручанай горам
балотнай травы
разгарыцца,
заўецца
касцёр веснавы.

* * *

Я ў руках трымаю
кніжачку старую...
Што я там убачу,
што з яе пачую?
Вось паўсталі навакол
вобразы прыроды:

месяц выплыў над ракой,
у лугах — паводка;
вось падвей мяце зімою,
лес абняўся з цішынёю,
снег скрыпіць —
і зноў вясна:
кветкі, сонца і краса...
Але раптам я адчула:
хутка будзе ўжо канец.
Гэту кніжку загарнула —
і чытаю зноў... яе.

## ЦЯЛЕЦ



*Вой, зачарую, зачарую —*
*і зажыўлю!.. І вызваленне —*
*гульня па іншых вымярэннях —*
*вяртае на зямлю сівую.*

# КВЕЦЕНЬ

* * *

Суцэльнасць, трываласць,
не пустка, а — праўда.
І лёгкасць паклала
пячатку істоты.
Душа моцнакрылая
з сэрцам упартым
раздоллем накрые
тугу і самоту.
Як добра, як слаўна,
надзейна і вольна!
Настрой не мяняецца
хуткасным ценем.
І шчасце пануе
над гэтым раздоллем
у думках і ў словах,
у кожным памкненні.

* * *

Зноўку пахне вясной.
Яркіх траў зелянее надзея.
Як мне трэба застацца адной,
каб — ні твару, ні руху, ні дзеі!

Мне б глыбока схавацца ў траве,
у малочных сцяблінах і росах,
каб не ведаць, не чуць, што заве
свету тлумнага шэрая постаць.

Мне б забыцца — ісці, як скрозь сон,
па раллі ізумруднага поля,
па шляху безуладным, дзе Кон
час не лічыць нікому ніколі.

Мне б адбіцца ў слязах ручаін,
не кранууўшы ні кроплі спакою,
каб з прыродай на безліч гадзін
мне нарэшце застацца адною.

* * *

Хутка стрэнецца жытло,
дробна сее дождж слязлівы,
залатыя пералівы
дорацць жыта і святло.
Лёгка мне лавіць імгненне!
На прыступках да нябёс,

вунь, стаіць аблочны геній,
аглядаючы пакос.
Лёгка бегчы, бегчы шпарка!
Азірнуся і бягу!
Дождж знясілены за хмаркай
я цягну на ланцугу!

## ПЯЛЁСТКІ

*1*

Нібыта спелы яблычак,
па сініх зор талерцы,
па нябёсах поўня ходзіць —
адчыняе дзверы
ў дзіўную староначку,
нябачную без сну.

*2*

Колькі цудоўных раслінаў бывае!
Не прыгадаю.
Дрэвы, кусточкі, травінкі і кветкі...
Частыя, рэдкія.
Гэта яшчэ адзін свет на планеце
з назваю «Квецень».

*3*

Там для мяне ў запаветным кутку
куст бэзу расце — у мінулым.
Я да яго працягнула руку —
і гладкае лісце адчула...
Тут — тайна,
пакіньце ж у тайне мяне...
На час, што не вычэрпны
быў у жыцці.

*4*

Галінка язміну ў пакоі маім —
магутныя чары хавае язмін.
На вуліцы — цемра, а тут, за акном,
напоўнена ноч і спакоем, і сном.

Тут пах-чарадзей ахапіў цішыню.
Тут свечка чытае малітву агню.
Тут цені малююць абшар на стале.
І бачыцца дзіва пры гэтым святле:

не дрэвы, а кветкі — у лесе густым
шапочуць пялёсткамі... Дзіўна, аб чым?
Ні слова, ні гуку, а ўсё стала ясна:
на кветкавай мове язмін ёсць прыязнасць!

* * *

Я захлынулася адчаем —
траву-мелісу завару,
напой змяшаю з чорным чаем,
укіну крохкую кару...
І вып‘ю гору на расстанне
я гэту чашу,
а праз міг —
сустрэну новае світанне,
правёўшы тусны маладзік.

* * *

Каменная ростань
над шэраю хмарай,
апошняй сустрэчай
мяне прывітала.
Яе ўжо не ўбачу,
але не забуду —
краіну ільдоў
і каменныя цуды!
Бывай, патаемнага

мора даліна,
ты будзеш яскравым
маім успамінам.

* * *

Я чакаю прысутнасці светлага
і вяртання законаў парушаных,
каб вянок для прарока сусветнага
ўскаласіўся не цернам, а ружамі.

Каб падзеі жахлівыя, змрочныя
саступалі з вайной і пажарамі,
каб высокія далі аблочныя
не змагаліся з чорнымі хмарамі.

Каб зямля цішыні ды спакою
з белай назвай і белаю вежай,
з белым тварам і белай душою
мела лёс свой такі ж беласнежны.

* * *

А чалавек — ён, бы расліна,
ад каранёў свой шлях вядзе,
расце на глебе напамінаў...
А я — і ў глебе, і — нідзе.

Такая блытаніна лёсу,
што з сэрцам робіцца маім?
Ні гарадоў, ні сціплых вёсак
амаль не ведаю зусім.

Чаго ж цяпер сяджу ў сталіцы?
Як сэрцу трэба памагчы
паветрам свежым наталіцца,
у светлым лесе адпачыць?

І вёска будзе мне чужая —
драўляных хатаў хлебны пах.
Я, ад‘язджаючы, хаваю
сваю тугу пад шэры дах.

Ні тут, ні там — нідзе не дзецца,
не знікну ў брудных каляях!..
Няхай ад сэрца і да сэрца
кладзецца роўнай стужкай шлях.

## ДОМ

Дом стары, што зведаў шчасце,
ды не доўга ім валодаў,
бо яму піковай масці
туз быў кінуты з калоды.

Дом стары, што бачыў смерці
ды праводзіў гаспадыню,
саграваў калісьці ў сенцах
для яе адной вяргіні.

Дом стары, дзе продкаў цені
па начах выходзяць ціха
ды ў загадкавым праменні
сцерагуць яго ад ліха.

Дом стары, што згорбіў плечы
з адзіноты і адчаю,

ды запаляць калі ў печы —
шчасце даўняе згадае.

Дом стары, дзе напаміны
аб дзяцінстве ў кожным кроку
тонкай бэзавай галінкай
стукаюць нячутна ў вокны.

* * *

Амаль што дванаццаць гадзін
са сном я — адзін на адзін.
Ён кліча мяне, уладар,
паплыць да бярозавых хмар.

Вясенняга неба настрой
спасцігнуць і знесьці з сабой
у край далячыняў зямных,
дзе сон мой — адзін на дваіх.

* * *

Прыгатаваць чароўны стол,
паставіць вазу з белай ружай
і свечкі дымны арэол
перавязаць блакітнай стужкай;

ваду прынесці і віно,
квяточны водар — лісце мяты,
зялёны колер да гарбаты,
і лёгка расчыніць акно;

сагрэць паветра на вуглях,
далонню зачарпнуць туману,

буйным падкрэсліць поўню планам,
расставіць зоркі па вуглах;

пасля пайсці расу спаткаць,
падкінуць думак на паперу,
хусцінкай абмахнуць Венеру...
І — можна свята сустракаць.

* * *

Апошняя ноч у святцёлцы —
больш вершаў пісаць тут не буду,
на сумна-стракатай вясёлцы
памкнуся насустрач да цудаў.

З сабой забяру і схаваю
аснову майго талісмана —
расліну, залечыць якая,
любую душэўную рану.

А ісціна што мне гаворыць?
Яна лепш за лепшага сябра
ратуе мяне і бароніць
ад ліха, нястачы і д‘ябла.

Віхор забяру я з сабою —
як сімвал шчаслівы, адкрыты,
як тайную сілу і зброю
для будучай з цемраю бітвы.

Нічога я тут не пакіну,
ніколі сюды не вярнуся,
на вокнах забыўшы ўспаміны,
і нават не азірнуся.

Праз сквер невыразны і шэры,
на могілках сціплых разбіты,
прайду я парой звечарэлай
віхурай зямнога блакіту.

* * *

Гэй, лёгкі позірк караля
на дошкі клетачных палях,
пастаў сумненням мат.

Хай сэнсу рушыцца сцяна,
бо і ў лагічным ёсць мана —
фатальны заняпад.

Таго, што спараджае страх,
глыбока седзячы ў грудзях,
не бойся, выхадзі!

З душы пацёмак глыбі-дна
цябе дастану давідна —
канец ва ўсім адзін.

* * *

Не трэба вершаў выдумляць —
яны прыходзяць самі:
калі прызначана пісаць —
не будзеш спаць начамі...

* * *

А забытая легенда кажа:
«Зло жыцця не абміне ніколі...»
І, як неба крэсліць чорнай сажай,
не спяшайся крыўдзіцца на долю.

У прыродзе ёсць мяжа таксама —
лета не сустрэнецца з зімою.
Апранае восень белы саван,
а вясна — адзенне маладое.

Дзень памрэ, каб распачацца ночы,
і яна — патоне ў лёгкім ранку.
Злое перавернецца аднойчы
дабрынёй... І так — бесперастанку.

* * *

Мне сем гадоў таму,
калі пісала верш,
той самы гук спяваў,
а з ім — спявала я.
І мяккі красавік
адкрыты быў наўсцеж —
адкрытая была
тады душа мая.
А зараз — позні свет,
кастрычнік робіць круг,
і сэрца абручом
сціскае недавер.
І зноўку на слыху —
пяе той самы гук.
Ды хоць той самы ён —
я іншая цяпер.

* * *

Волат-асілак, вясна і лагода.
Шчасце зямное — трывалае шчасце.
Каб прарасло яно парасткам згоды —
трэба зярняты ў зямельку пакласці.

Цёплае зерне жыцця і надзеі.
Сонца Цяльца выганяе на поле.
Волат магутны — не болей, чым сейбіт,
творыць вытокі да будучай долі.

Мірная праца — думнае здзейсніць.
Шчодрая позелень радуе вока.
Мары зямныя весняю песняй
лёгка ўзнімаюцца ў неба высока.

Праз абуджэнне жыцця і прыроды
травень буйнее, узводзіць і песціць
царства пачатку, любові, свабоды —
царства блакіту і паднябесся!

## БЛІЗНЯТЫ



*Я згубіла ключы ад сэнсу*
*і дарогі назад не маю.*
*Толькі спрэчкі на дне люстэрка*
*я па кроплі ізноў збіраю.*

# СУВЯЗЬ МЯЖЫ...

* * *

Быццам смужнае сузор‘е,
быццам лета на мяжы —
з цёплым днём і светлай доляй,
з праўдаю — сярод ілжы.
Знак рухавасці — і свята,
разам мёртвы — і жывы...
Ртутны мячык мкнуць Блізняты
споверх чэрвеньскай травы.
У настаўніках — Меркурый
вучыць шчасцю перамен.
Сонца хуткае даруе
радасць вечнасці ўзамен.

* * *

Нягнуткія рукі
ў гульнях суценняў.
Свечка ў цішы,
нібы праўда і сувязь.
Аб чым, спаталяючы
веды ў праменнях,
няшчырыя гукі
пяюць «алілуйя»?..

* * *

Я глядзела скрозь неба бяздоннае,
дзе аблокі натхнёна плылі,
і, зрываючы покрывы сонныя,
промні-думкі ляцелі з зямлі.

Я глядзела праз лета і сонечнасць,
і рабіўся бліжэй далягляд.
Калаўротам мінуўшчыны сённяшняй
час за часам вяртаўся назад.

Я глядзела праз вочы закрытыя
на працятую сувязь мяжы,
адарванага сэрца блакітнага
і далёкай касмічнай душы.

* * *

Абвяду бясконцы круг —
ні пачатку, ні рашэння.
Абсалютны плоскі шар —
дзірка іншых вымярэнняў.

Доўгі час гляджу ў яго
я абодвума вачыма:
кропля ў кроплю — два выданні
атрымалася ўсяго.

А цяпер — увага, сведка:
руш у розныя бакі
і глядзі — ляціць планета
трэцяй кропкай спаміж іх!

* * *

Сусвет напаўняецца водарам лета —
і я пагаджаюся з гэтым сусветам,
і я застаюся, і дыхаю ўволю
ў гэтым паветры надзеяй жывою.

Ні вечар, ні змрочнасць, ні дзень, ні світанне —
спакой невычэрпны і радасць чакання...
Шчаслівага лёсу, надзеі і мэты!
Сусвет напаўняецца водарам лета.

* * *

Сумна мне — і сумная нядзеля.
І наогул адзінота — вораг...
Вораг радасці, жыцця, надзеі,
сябра роспачы, нястачы, гора.

* * *

Лета ідзе на дарогу.
І цёпла. Ветру няма.
Такі парадак у Бога:
за восенню — будзе зіма.

Гэты парадак не новы —
яго не змяніць аніяк.
І сонца не выпадкова
праходзіць за год Задыяк.

І будзе вясна — за лютым.
Наступны — Авена ход:

па полі чырвона-бялюткім
пойдзе яго народ.

Ён — рыцар жыцця прамога,
ад сэрца і на вякі.
Такі парадак у Бога.
Зямлі парадак такі.

* * *

Парой самотна-звечарэлай
дуб прывітаўся малады.
Спявалі ціха а-капэла
на ім у ветры жалуды.

Застыла першая гадзіна —
чароўны час пабег ракой,
бо да мяне з акна галіна
амаль прабілася ў пакой.

Вяду рукой па ёй марудна —
халодна-жорсткае асцё
пакрыта светла-ізумрудным
у мяккім вобліку лісцём.

Люстэркі з неба ловіць зорныя,
ад лямпы — залатую ніць,
заве ў падзеі ілюзорныя,
пакуль мая свядомасць спіць.

* * *

На такім я раздарожжы
аніколі не была —

хтосьці лічыць, хтосьці множыць,
хтосьці дзеліць папалам.

Толькі я адна ў пустыні —
раздражнёнасць і адчай...
Сонца сушыць, сонца стыне
на шляху смяротных зграй.

Горды міг пераканання,
вецер, вынік і прастор...
Што, скажы, мяне чакае:
моц, удача ці тэрор?

* * *

Зварухнулася даль маладая,
сэрца сціснуў абруч залаты!
Я з калоды па карце кідаю —
выпадаюць тузы ды вальты.

Гэта значыць — турботы і весткі,
п‘яны госць пры дарозе начной,
а дзесятка з піковаю меткай —
абвяшчае жалобны пакой.

Трэфы чорныя — шлях, раздарожжа.
Непрыемнасць — праз даму бубей...
Толькі светлы кароль дапаможа
не спыніцца на гэтай журбе.

Вунь, дзевятка бубновая — грошы.
Восем чырва — дык дому глядзі!
Туз ад пікі шлях выслаў варожы:
куды хочаш — туды і йдзі!

Зварухнулася даль маладая,
развязаўся абруч залаты!
Карты кіну — забава пустая...
І даволі з мяне пустаты.

* * *

Мелодыя няўдалага кахання,
зламаны крыж, закручаныя рукі.
Скамечаныя сарамліва гукі —
як цукар-горыч, шчасце-пакаранне.

З былых часоў пакрыўджанае сэрца
даўно ператварылася ў аблокі.
Пачуцці рвуцца, нібы воўк з аблогі,
пад стрэламі асуджаны памерці.

Адзін настрой перакуліўся ружай —
і мрояцца нявідныя падзеі.
У вочы зазірну сваёй надзеі —
і праз адказ вышэй імкнуцца змушу!

Мелодыя парвалася праз мэты,
узнікла і, скарыўшыся, растала.
Яе пачуць — як многа і як мала —
дзеля таго, каб загучаць паэту!

* * *

Каб да ісціны мне дакрануцца,
заблукаю ў глухім лабірынце.
Скрозь схаваную купалам цемру
шлях шукала я з факелам ведаў.

Запаліце ж агеньчык таемны —
невядомы я шлях пачынаю!..
А ці скончу? Ці ў цемры сканаю?

* * *

Зірнула ў бязмежжа
з высокай гары:
закрэслена снежнем
зімовай пары —
ці тое бязмежжа,
ці тая пара,
ці золатку сонцу
да хаты пара?

Зірнула ў бязмежжа
з высокай гары:
збірае свет звесткі
аб чорнай дзіры —
ці чорныя звесткі
нямое дзіры,
ці п'янае сонца
паўзе па двары?

Зірнула ў бязмежжа
з высокай гары:
тут сонца няма
і звіняць камары...
Ды так мне і трэба —
з зары да зары
навошта сядзець
на высокай гары?

* * *

Не лічы мяне вядзьмаркай —
атрымалася няёмка:
ты ў старым сустрэўся парку
з прыгажуняй-незнаёмкай.

Праз такую выпадковасць —
закахаўся не на жарты...
Не глядзі, мілок, сурова —
праўду сёння кажуць карты.

Табе шчасце з ёй — не свеціць:
век кароткі лёг дзяўчыне...
Разрадзіцца першым дзіцем,
а сама — назаўтра згіне.

Можаш верыць ці не верыць —
ты ад лёсу не ўхінешся,
варажбы не пераверней
і ад праўды не прачнешся.

Так табе наканавана!..
Я ж — цікаўнасць наталіла
без усякага падману,
а цяпер — бывай, мой мілы.

* * *

Дрыжыць аловак — я табе пішу...
Хвалююся, бяру чарговы ліст —
радкі няроўныя пабеглі ўніз,
каб з пятак ратаваць маю душу.

Мне і з паперай цяжка размаўляць —
губляюся і сам сябе лаўлю:

вось зараз выведу, што «I love you»,
ці — «не» дарэчы будзе напісаць?..

Так думаў я ў каханні ды журбе —
і напісаў гарбатымі радкамі:
«Я сэрцам і душой цябе кахаю...»
І гэта сэрца пад руку мне б‘е!

* * *

Жоўты пояс — каменная постаць —
вырысоўваецца з вады!
Падалося надзіва простым
павярнуць маладыя гады.
Мітусліва схапіць «учора»
і дарэшты свет успрыняць,
як і пройдзены час, каторы
дзесьці знік... І будзе знікаць!
Заблукаць на часовых колах,
аднавіўшы старыя сны
па законах падзей выпадковых,
дый вярнуцца на пункт адпраўны.

* * *

Вось ісціна, прынятая бяспрэчна.
Тут меркаванняў быць не можа двух —
такі закон на свеце чалавечым:
жыццё ёсць рух!..
Жыццё ці толькі рух?!.

* * *

А між тым — пачынаецца лета...
Лёгкі сум. І ярчэе зямля.
Я цяпер прачынаюся з шэптам
маладога жывога галля.

Колькі радасці, шчасця і моцы
дорыць роднай зямлі краявід!
Адчыніце істоту лістоце,
удыхніце нябёсны блакіт!..

Хай хоць гэта, адзіна святое,
ушануе пакутны наш край.
Паглядзіце, як сонца з вясною
павянчала задымлены гай.

* * *

Я ўначы заснула Купавай —
і столькі было бяды:
ні налева і ні направа
не звярнуць ад агню-вады.

Людзі-здані ідуць няпэўна,
запыняюцца ля агню...
Сёння дваццаць другое. Чэрвень.
Пакланенне доўгаму дню.

І вадзе, і зямлі, і сонцу,
і паветраным струмяням...
Для мяне там няма абароны —
і таму прачынаюся я.

* * *

Неразумнаю вясною,
што зрабілася са мною?
Я хвалююся, сумую...
Любачка — смяецца:
— Ой, ратуйся!.. Не ўратуеш,
не ўратуеш сэрца!

І цяпер, гарачым летам,
не такі, якім быў летась,
я хвалююся, сумую...
Любачка — смяецца:
— Не ратуйся... Не ўратуеш,
не ўратуеш сэрца!

На зямлі шчыруе восень,
а са мной не тое штосьці —
я хвалююся, сумую...
Любачка — смяецца:
— Не ўратуеш... Не ўратуеш,
не ўратуеш сэрца!

**РАК**



*Нервовая кветка жыве ў глыбіні —*
*пульсуе, гарыць, адчувае...*
*І розум трымае ўвесь час у агні*
*таму, што яна — жывая.*

## МЕСЯЦОВАЕ СВЯТЛО

* * *

Месяцовае святло
сум прадзе.
Ціха пляскае вясло
па вадзе.

У нябёсах стомны Рак
заблукаў.
Месяц скрэліў Задыяк
і прапаў.

І па сцежцы ў сіняву —
да агню
я на лодачцы плыву
ў вышыню.

Сустракай мяне хутчэй,
небакрай.
І над возерам ярчэй
дагарай.

* * *

Лашчыцца сіняя хваля ля ног.
Летняя ноч. Цішыня. Хваляванне.
Месяц зайграў у сярэбраны рог —
ён абвясціў паляванне.

Зорную зграю спусціў на прастор...
Гончыя псы насцігаюць ахвяру —
брэх іх ліецца да глотак азёр
і павісае на хмарах.

Дзіўна, не спіцца пад водар лясны.
Стома ад цёплай вады адсырэла.
Шпарка імчацца загнаныя сны
пад месяцовыя стрэлы.

Лашчыцца сіняя хваля ля ног.
Раніца сонцам прайшлася па вейках.
Хутка вярнуся пад замшавы мох
стужна-агністаю змейкай.

* * *

Дзе шмат — там няма асобы.
Дзе край — там няма зямлі.
Дзе цемра табе даспадобы —
там святла не палі.

Дзе шмат — там заўсёды разам.
Дзе край — там гарыць датла.
Дзе цёмна за светлым часам —
і там не палі святла.

Дзе шмат — гэта проста многа.
Дзе край — гэта проста ніць.
Дзе цемра — твая дарога...
Там можаш паліць.

* * *

Зачаруе ноч у сне
ясназорым вітражом,
покуль дзень не паласне
па вачах рудым нажом.

Для шукаючых абноў
вецер-змоўца, пустабрэх,
першабытных туманоў
пустабокі скіне мех.

* * *

Далёкі дзень — даўно ў мінулым.
Прырэчны луг і гарадок —
усё спынілася, паснула...
І толькі ён не спіць — радок.

Ён на старонцы і ў прасторы
малюе вобраз мёртвых дзей:
жыве, хвалюецца і творыць —
вяртае з небыці людзей.

Ён — памяць, мы якой — не сведкі.
Нас не было, а ён — схапіў
і захаваў яе ад Леты,
і пераносіць скрозь вякі.

* * *

Ёсць люстра мінулага ў сэрцы маім,
люструюцца пільна ў ім горыч і здрада.

Хаваецца, туліцца ценем густым
усё, што мінула: і гора, і радасць.

Імкнуцца пранізлівай рыссю гады
заўжды развітацца са светлай прасторай
і, быццам праменьчыкі ў шклянцы вады,
ламаюцца лёсы ў гаркавым міноры.

* * *

На світанні далёкім
  цудадзейнае слова
заплялося з раслінай
  душы каранямі,
дзе злучае замова
  жывыя вытокі
рэчаіснасці ведаў
  з агнямі.
Разгараецца сонца
  над слаўнай далінай.
Адчынілася брама
  святой таямніцы.
На далонях святло
  жыватворнай галіны
разліваецца светлай
  крыніцай.
Цудадзейная моц
  выпраменьвае радасць,
і пануе спакойная
  шчырая воля.
Тут раскрылася кветкай
  прыгожая Лада
на сінеючым полі.

* * *

Лета, надыходзячы, прынесла
мне імя світальнае — Купава.
Думкам-крылам раптам стала цесна —
і яны ўзляцелі ўвысь рухава.
Над лясным шырокім краявідам
раўнадзенства мару адчыняе...
Пах травы і росквіт цудадзейны!
Белы свет на лета адзявае
доўгае бялюткае адзенне.

* * *

Плыву па чыіхсьці слядах,
мяне абдымае вада.
Мне дыхаць не трэба зусім,
бо я ўжо не ў свеце — над ім.

Згарэўшы ў блакітнай зары,
згубілася ў цёмным віры.
Нікога вакол... Я адна
імкнуся з азёрнага дна.

Да яснага дня падплыву,
схілю перад ім галаву —
і ў звонкай лугоў сіняве
спачну на вільготнай траве.

* * *

Пакахала поўня дрэва.
Апускала срэбны невад
белых птах.

Па лістоце шапацела,
на руках яго гарэла
 па начах.
Ніткі тонкія цягнула,
на яго глядзела чула
 ўсё адна.
І луналі ў небе спевы
жаўтавокай каралевы
 давідна.
 Месяцовае каханне.
 Незямное пачуццё.
 Неразгаданая тайна.
 Неразумнае дзіцё.
Пакахала поўня дрэва.
Апускала срэбны невад
 белых птах.
Па лістоце шапацела,
на руках яго гарэла
 па начах.
І змяняць хацела неба
на разбуджаную глебу —
 толькі б быць
ёй, хоць птушкай шызакрылай,
неразлучна побач з мілым
 назаўжды.

* * *

Пачуўся незнаёмы гук —
і сэрца запаліў чаканнем,
нябёсы з пасмірэлых рук
каштоўны выпусцілі камень.

Ён боўтнуў зоркай у ваду —
і прыняла рака

яго ў сівую бараду
цара-вадзяніка.

Вось так чароўны скарб гарыць,
а гаспадар — на дне
куклянкай скручаны ляжыць
на роўнай баразне.

Багаццю ведае цану...
Каб толькі падрамаць —
ён за хвіліну свайго сну
гатовы ўсё аддаць.

* * *

Сінявокае навокал
падбіраецца да вокнаў,
зазірае ў іх цікаўна,
і смяецца ночка-панна.

Сонца вогнішча затушыць
і пашле аблочных птушак
аблятаць наўкол нябёсы
і ўплятацца ночцы ў косы.

Па нябёсах ходзіць вечар,
задзімае промні-свечы,
пакуль не выплыве з-за хмары
каралева поўня-мара.

* * *

Поўня — ліхтарык плоскі —
свеціць з вышынь нябёсных,

шле на зямлю пялёсткі
яблыневай пары.
Я набіраю жмені
мройных паўночных ценяў,
а на душы — зацьменне,
што там не гавары.
Дрэмле пакой спакойны,
я зачыняю комін,
а праз акно няўмольна
льецца святло гульні.
Рэчы вакол паснулі —
позна гуляць у гульні,
позна імчаць, як куля,
па залатым агні.

* * *

Удзелася нітка часу ў іголку —
і пашылася ветру кашуля.
І кінула швачка-вечнасць
вопратку лесу ў прастору.
І хто здолее апрануць яе —
варты жыцця.
А я ж буду
разгадваць узоры бясконцасці,
покуль не згасну.
Агонь свечкі ў руцэ неабсяжнай —
запаліў ён і сонца, і сэрца!
Зранку я шлях пачынала
да іншай падзеі.
І спынілася, паланёная стомай,
на чорнай паляне.
І пабачыла дзіва:
стары, мохам зарослы, калодзеж,
што сярод гушчару

выливае з вадой сваю споведзь
і губляе ў траве.
Схіліўшыся, я зачарпнула
сцюдзёнасць далонню
і кінула словы ў калодзеж:
— Калі мудрасці ў сэрцы тваім
столькі ж, як і вады, —
назавеш ты мой колер...
Нібы кроплі, зліваліся гукі,
і пачулася мне:
— Для сэрца — чырвоны,
для вачэй — зялёны,
для розуму — сіні,
для жыцця — белы.
А чорны, калі зможаш,
дык — мне пакінь.
...І пайшла я далей
па слядах той стыхіі празрыстай
за срэбнаю змейкай маленькай
дзіцяткі-крынічкі,
якая імкнулася хвалям насустрач.
Я выйшла на ўзлесак —
і вочы здзівіліся хвалям сінечы,
што з плёскатам білі ваду,
а побач — сцяною ўзвышалася
зялёнага лесу адзенне.
Я ўдзячная шчодрай зямлі
і вадзе жыватворнай
за колеры праўды.
А зараз — далей у краіну,
дзе іншая будзе істота магутнай стыхіі.

Роўнае, дзіўнае, гладка-вятрыстае возера
стомлена дыша спакоем і восенню.
І змрочнае сэрца хавае за вірам сцюдзёным
адзіншага сэрца — праклёны,
што сонца бязлітасна дорыць,

адбіўшыся ў гладзі...
І жоўтае сэрца няспынна пульсуе на хвалях —
і гэтак да ночы.
Пакуль толькі месяц праклёны не зменіць
багаслаўленнем халоднага міру —
і гэтак да ранку.
Я ў ранішняй чырвані
колер хачу ўзяць для сэрца.
А як дацягнуцца да неба?
Не ведаю, хто дапаможа —
прашу дапамогі.
І хвалі прынеслі чырвонага возера кроплі,
дзе сонца агністасць злілася
з празрыстай вадою (слязою азёрнай).
Я ўдзячна агню і вадзе.
І крочу за колерам белым па воднай стыхіі.
Аблокі...
Я ўдзячна за іх і вадзе і паветру.
Няма чысціні больш танюткай, ласкавай.
Не трэба жыццёвага шчасця прыкметней...
І толькі жахлівыя чорныя хмары
маланкі нябёсныя крэсляць.

Ліў дождж...
Я прамокла да ніткі.
І доўга шукала калодзеж,
якому пакінуць магла б я
пагібельны колер,
дарэмна.

* * *

Вакол распятага сусвету
надрыўна плакала струна.
Над ёй у словах лётаў ветах,

дастаўшы мудрасці спаўна.
Калі закручаныя лёсы
калодзеж існасці прыняў,
жыцця і ён хапіў удосыць —
дый згаснуў напачатку дня.

* * *

У ноч на Івана Купалу
я шукала плакун-траву,
адзела сукенку белу,
вяночак — на галаву.

Крыж зняла, бранзалет і кольцы,
пакланілася на ўзыход,
каб праменьчыкі бацькі-сонца
зберагалі адвечны род.

Скрыжаванне пакінула полю —
і ўзышла на русальны шлях,
выціскаючы з сэрца на волю
першабытны жывёльны страх.

Жывасіла сарвала кветку
і замову хутчэй шапчу,
каб не трапіць у гіблае пекла
ці на снеданне крумкачу.

Каб пазбегнуць усіх нячыстых
і знайсці патаемны дар,
утрымацца на дрэве хісткім,
некранутым пакінуць скарб...

І пасля на ўзлеску далёкім,
дакрануўшыся да аблок,

зразумею — які высокі
застаецца да мары крок.

Так і ёсць, так было ў мінулым:
праблукаўшы той час агнявы,
я стамілася і заснула
на паляне плакун-травы.

* * *

Спякотным летам у гэтым годзе
ў азёрным краі была. І годзе.
Плыла ў закаце, і ўжо не буду...
Бывайце Струста, Дрывяты, Снуды.

Была русалкай, сястрой азёрнай,
на хвалях цёплых люляла зоры.
Па сцежцы сонца пайшла світаннем,
луску змяніла на развітанне.

* * *

Чаму цётка мая не пяе?
Яе песні здалёку чулі...
Пэўна, радасць і мары свае
пахавала разам з матуляй.

І маўкліва-жалобны плач
аддае ёй у сэрца рэхам,
бо дачка яе — вопытны ўрач —
не знайшла для старое лекаў.

Развітанне, малітва, страх,
нараканні на гора-долю...

І яшчэ — акіян у вачах
невычэрпна-зямнога болю.

* * *

Разгорнутая кніга на стале...
Забытыя старонкі праз стагоддзі
са скарбніцы суцешаных мелодый
патрапілі міжволі да мяне.

Акорд узяты, лёгкі ўзмах, спакой.
І век былы, як таямнічы дар,
нязменны і няспынны каляндар
перагарнуў назад сваёй рукой.

Рака падзей пранеслася над ім —
імчацца коні ўздоўж па лузе шпарка.
і вецер б'е над вытанчаным замкам
стары забыты беларускі гімн.

І людзі незнаёмыя са мной.
Трава пажоўкла, белае адзенне...
Закрэслена апошняе памкненне,
апошні кліч вяртання з кнігі той.

**ЛЕЎ**



*Да казкі чароўнай пайсці роўным лугам*
*па валошкавай сцежцы ў засень лясоў.*
*Спыніцца ля млына, пад жорнавым кругам*
*схаваць таямніцы чароўных часоў.*

## ВОГНЕННАЯ КАЗКА

* * *

Залатое сонца.
Залаты абшар.
Залатое лета.
Жоўтагрывы цар!
Шэрая шчаціна
на яго шчаках.
Берагі з бурштыну
на яго баках.
На лугах — пакосы
сонечнай травы,
а над ёй — нябёсы
чыстай сінявы...
Грозна — рыкам страшным —
кажа ўсім свой гнеў
уладар паважны
мяккалапы Леў.

* * *

Я зноўку прагну цішыні,
а за акном — туман і мора,
і слаба свецяцца агні
маёй каморы.
Я адчыніць хацела дзверы
і паглядзець на поўню шчыра
самотным дзікім гордым зверам,
што ў свет прыйшоў

і прагне міру.
Як падарожнік даўніх дзён,
што ўжо прайшоў палову шляху
і ўсё спазнаў — агонь і боль, —
і цень яго не варты страху.
Вось ён таксама, як і я,
сачыў у ноч за жоўтай поўняй —
таксама штосьці пазнаваў,
і быў бліжэй да зорных промняў.

## ВЕЧАР

Ціхі вечар,
звычайны і кволы.
Цёпла, нават пяшчотна.
Імгла.
Я зрываю
агонь невясёлы
з дробных кропляў
спацелага шкла.
А што там,
за адценнем маркотным?..
Адчыніўшы акно, пазнаю
ў дзіўным бляску
разбуджаных кропляў
разудалую песню сваю.

* * *

Цёплага лета чулыя хвалі
зачаравалі, закалыхалі.

І супакоілі, і прытулілі.
Штосьці схавалі, штосьці адкрылі.

Росная раніца мокрай травою
рану вялікую робіць малою.

Сонца праменьчык, жвава-бязважкі,
дзень прышпіліў пазалочанай спражкай.

Птушкі пяюць пра свабоду і волю,
лёгка ісці мне па жытнім раздоллі.

Шаль тумановы спадае на плечы,
з небам бяздонным сыходзіцца вечнасць.

Вячэрняю кола замкнецца пароюі...
Зорныя сненні. Летнія мроі.

* * *

Хачу быць прыгожай — як зорка,
як кветка ў бялюткім садзе,
як поўня на снегападзе...
Каб мне не было так горка.

Разгледзець хачу аднойчы
праз люстраў празрыстасць мора,
праз заўтра — цераз учора —
свае васільковыя вочы.

* * *

Я прашаптала небу:
— Дай руку...
Паваражу,
што ў цябе на вяку.
Скажу:

будзе шчасце ці гора —
не зманю,
тайну адкрыю
загадкавых зорак.

Згадзілася неба —
як іншаму быць? —
па сетцы-сузору
на лёс варажыць.
Зямлю асцярожна
ў далоні ўзяло —
згубіліся зоры,
пагасла святло...

Не бачу я рысаў
за цёмнай парой.
— Ідзі пашукай
варажбіткі другой.

* * *

У хаце драўлянай
і светла, і ўтульна.
І сонца заводзіць
над комінам гульні...
І коцік пушысты
гасцей намывае —
знаёмае нешта
пра шчасце згадае.

* * *

Сярод батанічнага саду,
абвітая льном вінаграду,

стаіць мая альтанка.
Я ў ёй сяджу часамі:
то — мару, то — чытаю,
альбо лічу вяснянкі
і сонечных зайцоў.
Маршчыністае сонца,
каб толькі мне не мерзнуць,
праз лапкі вінаграду
пяшчотны шле агонь.
Так цёпла і прыемна!..
І я лаўлю праменні
распушчанай касою
вясновых валасоў.

* * *

У святле ліхтарным мроі
разгарнулі свае крылы...
Я стаю над цішынёю
ля забытае магілы.

Нерухомая пустэча
задуменна-бездакорна.
Крыж драўляны —
крыж нявечны.
Вечны крыж — на небе зорным.

І як дзёран беспрытульны
абжывае месца гэта —
саван адзіноты гулкай
апаноўвае паветра.

Толькі моўчкі плача дрэўца —
да капца галлём хінецца,
нахіляецца ад ветру
і ніжэй ад болю гнецца.

Двойчы нізка пакланюся:
раз — магіле, раз — бярозе...
Ціха ў ночы памалюся —
і пайду я па дарозе.

Спі спакойна, чалавеча,
у зямлі сырой і чорнай...
Нерухомая пустэча,
быццам неба, бездакорна.

* * *

Наталі надзею маю,
наталі надзею на дар:
зразумей і надай агню —
у крыві маёй каб палаў...
Наталі палымяную прагу.

* * *

Прастора поўная блакіту —
ружовы дым, паднебны дах!..
Там ёсць жыццё, якое скрыта,
бы сэнс таемны на лістах.
Душа мая — як неба гэта.
А сэрца — нібы сонца ў ім.
У думках хмарным фіялетам
схаваўся мой ружовы дым.

* * *

Святло тушу,
а музыку не буду.
Мне падабаецца,
калі яна гарыць.
Я з ёю дакранаюся да цуду
і пакідаю часу год стары.
Мой цень прыпаў
алоўкам да паперы
і цяжка штосьці ўбачыць
без святла.
Над галавой
праменіцца Венера,
душу мне спапяляючы датла.
А музыка —
яна гуляе з ценем,
пускае ноч па свеце,
акрамя
часовага, нязбыўнага натхнення
і ціхага світальнага імя.

* * *

Не магу не вяртацца сюды,
дзе ўсё родна, утульна, знаёма
і пад кветам бялеюць сады
паабапал бацькоўскага дома.

Дзе здаецца сівая зіма
каляровым, разважлівым маем.
Дзе сябе я знаходжу сама,
калі раптам згублюся ў адчаі.

Тут спагада жыве з дабрынёй,
вызалочвае вокны бяспечнасць,

цёпла пахне жытнёвым агнём
нават летам з няпаленай печы.

* * *

Няхай мне будзе лёгка і шчасліва...
І мора падыходзіць мяккай хваляй
да берага далёкага заліва,
разлітага ў маёй дзіцячай спальні.

Нядоўгі час — і хутка мы паедзем
з мясцін сцюдзёных да ляснога краю.
Здаецца мне: у сваім сэрцы недзе
я спадчыну вялікую хаваю.

Я казку забіраю назаўсёды —
няхай са мною будзе ў часе дальнім
той мяккай хвалі жыватворны подых,
выток жыцця майго сакральны.

* * *

Неўтаймаванае сэрца —
б‘ецца, б‘ецца і б‘ецца...
Б‘ецца да самай раніцы
і не баіцца параніцца.

Каб над душой сваёю
ды не сысці крывёю,
з гойнай лясной крыніцы
спяшае вады напіцца.

* * *

Абмакнула ў шклянку з цемрай
лебядзінае пяро
і кранулася паперы,
каб світаць не пачало.

Кружаць літары і гукі,
нібы крылы, б‘юцца рукі,
у пустэчы цёмнавокай
льецца белае віно.
Я гляджу, гляджу навокал —
сотні люстраў, сотні вокан...
Зазірнуць у іх таемнасць
мне хацелася даўно.

Абмакнула я ў празрыстасць
лебядзінае пяро.
Расчапіліся маністы
зор, і днецца пачало.

І стаю я ў захапленні,
а вакол — танцуюць цені.
Цеплыню вады халоднай
загарнула я ў далонь.
І ў апошнія хвіліны
сонца з хмары-каляіны
вылятае на сінечу,
быццам агнягрывы конь.

* * *

Вунь кошка падышла —
лабуніцца, махлярка,
аб ногі трэцца

мяккай гнуткай спінкай.
Жывёліна,
але трымае марку:
нашкодзіла —
і лашчыцца бязвінна.
Як не даруеш ёй?
Такая малайчына!..
Ласкавае цяля
двух матак мае...
На гэтым
хітраватая каціна
карцінна
адыходзіць і знікае.

* * *

Каб бачыць поўні адварот
у ноч нязвыкла крохкую,
крадуся ціха праз чарот,
дагнаўшы думку лёгкую.

Яна дрыжыць. Яна заве —
бы жоўтая манета.
Я падплываю да яе,
глытаю водар лета.

Не разлічыла хваляў строй —
не ў глыбіню нырнула...
І неўзабаве галавой
па поўні чыркванула.

І поўня ў валасах маіх
заблыталася гэтак,
што ў яе промнях залатых
купаюся дагэтуль.

* * *

Ёсць царства таемнае,
царства глыбокае,
дзе сны шалясцяць
па-над сіняй затокаю.

Дзе колер змяніўся
з надвор‘ем і гукам,
дзе месяц і сонца
заходзяць па кругу.

Людзей ахінаюць
туманнымі крыламі
і ў шлях выпраўляюць
чароўнымі сіламі.

Там казка няздольна
ўсяго зразумець —
і выйсце адно:
паляцець, паляцець!..

## ВОГНЕННАЯ КАЗКА

Я пакінула сябе
легкадумна — да вар‘яцтва —

у гэтым свеце, у імгле,
за агонь-святло змагацца.

Меч у похве, слаўны конь —
я раблю агляд па лесе...

Папараць хай уваскрэсіць
той загублены агонь.

Вунь кастрычча на паляне!..
Ну, хадзем, мой коню, глянем.

Дзіва: полымя, вада
ды русалак чарада.

Я ўжо ў гэтым карагодзе —
у тумане-асалодзе.

Толькі конь іржэ ды кліча
адысці ад дзеў крынічных.

Да мяча цягну руку —
і адтуль на ўсім скаку,

не дай Бог, пайсці па кругу...
Ну, нарэшце, еду з лугу.

А насельніцтва лясное
зноў спяшаецца за мною.

Так скрыгоча небяспечна...
Я — за меч, а меч — у сечу.

Вунь агідная старая
па-над елкай пралятае

ў цяжкай ступе з памялом,
неба крэсліць чорным злом.

Чэрці, іншыя пачвары,
па адным альбо па пары,

падхапіліся ўсе ўраз —
паляцелі на шабас.

Верахаводзяць імі ведзьма
і стары, што ходзіць ледзьве...

Надта дзікая гульня!
За аброць бяру каня.

Не ўтрымалася, аднак,
і цяпер я — ваўкалак.

Конь уцёк, а я ў адчаі
па глушы адна блукаю.

Праклінаю ўсё на свеце...
Раптам бачу — сонца свеціць.

Я хутчэй бягу па яры,
набліжаюся да мары.

Лапу шэрую цягну,
завяршаючы вайну.

Што за дзіва гэта кветка?..
Вам — маё аблічча сведка.

Конь прыбег, а з ім — удача:
за фартунай і паскачам!

## ДЗЕВА



*Вакол павольна змрок спаўзае.*
*на небе зорачка відна.*
*Яна мне ціхенька міргае*
*праз шыбу сіняга акна.*

## ЗОРНАЯ ПАННА

* * *

Зорная панна
над светлай калыскай
песню спявае
маленькаму Мінску:

— На рацэ туман
шалем сцелецца,
на старым млыне
лёсы меляцца.
Жорны тамака —
калаўротныя...
Будзеш ты расці
дужым волатам.
З чатырох бакоў
прыйдзе рознае —
будуць радасці,
будуць ростані.
Працаваць — табе.
Ваяваць — табе.
Гаварыць — табе.
Вызваляць — табе...

Кон, што спрадвеку
зямлю даглядае,
гэткай жа долі
дзіцяці жадае.

Сонца — і тое
над светам павісла,
косы ўраніла
ў лагодную Свіслач.

* * *

Хто ведае роспач —
мяне зразумее:
бязлітасна проста
сышліся падзеі.
Ізноўку па кругу
замкнулася кола —
я выйсця шукаю,
ды безвынікова.
Сцяны не прабіць
і не скінуць аковы —
вавёркай у клетцы
я рухаю кола.

* * *

Хусцінку вецер з плеч зрывае...
Я прытулілася да плота
і зачарована ўдыхаю
вільготны пах жывой лістоты.

Знямелі росныя сцябліны,
каменні мокнуць, плачуць дрэвы...
Ліюцца з ранішняй гадзіны
тужліва восеньскія спевы.

І дух нямы вакол пануе.
Інакш — адкуль такі спакой?..
Маўклівасць з песняй пасябруе,
каб жыць стыхіяю адной.

* * *

Раскрыўшы вечнасць думкі
ў засені хвіліны,
заўважыш: пані-сутнасць
схавае злую міну.

За вэлюмам закону,
парадку, этыкету —
з пажадлівым паклонам
пасадзіць цябе ў клетку.

І будзе гаспадыняй,
а ўбачыш — як сяброўку...
Дзень вэлюмам накрые —
і ты, як птушка, змоўкнеш.

І ўлады не адчуеш,
а ўб‘ецца ў сэрца — клінам,
дзіця раптоўнай думкі
ў засені хвіліны.

* * *

Вусны сухія, знясілены твар.
Белыя пальцы, мяккія рукі...
Злая хвароба нанесла ўдар
целу майму і духу.

Не, я мацней, чым адкрые пагляд.
Там, унутры, — толькі як растлумачыць? —
нехта пачуе бясслоўны загад
і падтрымае ўдачай.

Вусны сухія — усмешка на іх.
Белыя пальцы хваробы ніякай.
Нешта далёкае радуе слых
музыкай сфер Задыяка.

* * *

Няхай мары мае забываюцца.
Няхай сэрца маё пяе.
Няхай зорка ярчэй разгараецца,
калі я пагляджу на яе.

А калісьці далёка пунсовую
зараніца пускала пятлю,
калі Сіта хадзіла праз полымя
да вяртання ў сырую зямлю.

На далоні раскрыецца ўзорамі
таямніца далёкіх часоў,
адбіваючы ценямі хворымі
абразы агнявых валасоў.

* * *

На сценах партрэты —
выявы людзей.
Іх болей ніколі
не стрэнеш нідзе.
Іх лёс, адгарэўшы,
расстаяў у свеце...

І толькі аблічча
жыве на партрэце.

* * *

Здаецца, прыйдзе свет
у залатым хітоне,
як залаты ранет,
спачне ў маёй далоні.

І спраўдзіцца тады
мой сон неразгаданы.
І расцвітуць сады
пад воблачным дыванам.

У казачнай глушы
заб'ецца птушкай рэха —
і на маёй душы
заззяе поўняй ветах.

* * *

Зацягваюцца гады й дні
сонцам,
марозам,
вятрамі й часам!
А таямніца кранута нікім не будзе —
я з ёю сам-насам.
Адна засталася ў цэлым сусвеце
за межамі шчасця —
на медным партрэце.

* * *

Дрэвы ў світарах зялёных —
восень ціха спее
на высачэзных клёнах
па бакавых алеях.
Што яна за вар‘ятка —
з ветрам ізноў рагоча!..
Болей няма ёй занятку —
кроў зялёную смокча.

* * *

Дождж — няўтульна,
мокра, вяла.
Ранак. Холадна.
Я ўстала —
басанож іду
да вокнаў.
Мне няўтульна,
адзінока.
Горка, што
праходзіць лета,
а душа —
не абагрэта.
Што свядомасць
ціха млее,
што душа мая
сталее,
што злілося
неба з шэрым,
што нікому
я не веру...
Толькі дзесьці
мяккай парай
на ваду

садзяцца хмары.
Неба
поўніцца блакітам,
дожджык
цішыцца нібыта.

* * *

Млява, бясколерна, вяла
кацілася сонца ў вырай.
На мокрыя выспы клала
цені густым пункцірам.

Каменне, а побач — поле
роўна гарыць рамонкам.
Да паднябеснай столі
сцелецца гарызонтам.

Лета пакінута мала —
жніўнем сцяжэлі крылы...
Я на каменне паклала
свае чароўныя сілы.

Чары, а побач — поле
золата дорыць свету.
Вогненны льецца колер
з поўневага планшэту.

* * *

Апошняе, лёгкае, светлае, мілае —
святло на руках абгарэлага дня —
застыла, тугой павуцінкай скруцілася
на тоўстым запясці струхлелага пня.

Скідаюць расліны багатую вопратку
на вытканы вераснем жоўты дыван,
і мякка чапляецца ватай салодкаю
за тонкае голле бухматы туман.

Збуцьвелае лісце пад дрэвы звалілася,
скамканае ветрам, ад лета бяжыць...
Апошняе! Лёгкае! Светлае! Мілае!..
Што нават у восень так хочацца жыць!

* * *

Вершы з цвёрдай абалонкай,
з мяккай песняй унутры,
на раскінутых старонках
паміраюць на кастры

не ад восеньскай завеі,
не ад горкага лісця,
не ад ветра-ліхадзея:
іх агню аддала я.

Я, што ў зменлівым настроі
павярнулася ісці, —
пасварылася з сабою
ўпершыню ў сваім жыцці.

* * *

Прыгожая паненка,
вытанчаныя рысы —
вабна-таемная
постаць актрысы...
Не дасталіся калі б
тэатру

яе прыгажосць,
яе талент...
Цікава,
як склалася б «заўтра»
для пані?

* * *

Сад у сутонні дрэмле. Схіліліся галіны.
Скаціўся яблык у начную сінь.
А я лаўлю бясконцыя ўспаміны
і адпускаю іх у далячынь.

Начны настрой перахапіў дыханне...
Як страта незваротная мая,
прыходзіць ноч да позняга світання
апошняга — у гэтым леце — дня.

* * *

Удыхну туманнасць зор.
Адамкну ад сну павекі.
Абдыму душой прастор.
Абмакну аблокі ў рэкі.

Пах збяру з усіх лугоў.
У лясоў вазьму жывіцы...
Шчырасць сонечных часоў
спаталю на зараніцы.

Змрочны шлях у вышыні —
варажу па росных зорах.
Я адна на ўсёй зямлі!..
Я губляюся ў прасторах.

**ШАЛІ**



*Кажаш ты:*
*— Ні радка пра каханне няма!*
*— Можа быць...*
*Можа быць, я — каханне сама?!.*

## ВЯРГІНІ

* * *

У восеньскім вянку —
прыціхлая багіня
чароўнага агню
і летняй цішыні,
сыходзячы ад нас,
пакінула вяргіні —
прыгожы напамін
пра залатыя дні.
Пялёсткі іх гараць
у паслухмяных пальцах.
А думкі ўсе — адно
ляцяць у цёплы край.
І летні каравай
стаў восеньскім акрайцам...
Ну што сказаць? Бывай!
Вяртайся — і бывай!

* * *

Празрыстая мяцеліца са сноў...
Я да сузор'я палячу світаннем
у водары някошаных лугоў,
у летні час кароткага спаткання.

Мне лёгка смагу думкай наталяць,
перавярнуцца птушкай у палёце

і доўга па-над рэчкаю лунаць,
і ценем усміхнуцца на лістоце.

Вярнуцца ў замак свой і засынаць,
нязбытнай марай паланіўшы вочы,
і кветку сну майго пацалаваць —
нямую служку каралевы-ночы.

І тут, у краі цуда-хараства,
угадваць лёс зусім-зусім няцяжка
па ніці, дзе прыродная душа
злучаецца з людзьмі і неабсяжным.

* * *

Парушыць нельга мне
святую раўнавагу,
бо помста не міне
са мной сустрэцца зноў.
А зараз — позна ўжо —
дазвольце, я прылягу
і адвяду сябе
ў рахманы вырай сноў.

* * *

Раздвоіўся надсвечны язычок,
люструецца агонь на шкле аконным —
здаецца, ён ад халадэчы ўцёк
у лісце пазалочанага клёну.

Хто з іх сапраўдным полымем жыве?
Яны паветрам дыхаюць абодва.
І рэчаіснасці яны ствараюць дзве
з вытокаў незнікальнасці прыроднай.

Мядовы воск — бурштынная смала —
застыў на міг, звязаўшы сэнс апальны,
па розныя бакі сляпога шкла
спыняе колер думак развітальных.

* * *

Гэтая музыка...
Пэўна, калі памірае
штосьці ў сэрцы маім,
яна іграе, іграе...
Бы думка са мной жывая,
жывая — як сад, як лес,
яна іграе, іграе
бясконцай тугі паланез.
Гэтая музыка...

* * *

Восень грэецца кастрамі.
Пахне быццам бы вясной.
Лісце б‘ецца пад нагамі —
абрываецца настрой.

Побач з жухлай крапівою
вяне кветка, стыне сад.
Забірае ўсё зямное
восень-панна ў лістапад.

Запаволеныя рухі...
Мільгацяць парыўна дні...
Цягнуць дрэвы зябка рукі
да апошняй цеплыні.

Цёплай дымкай павуціна
спачывае на траве...
Неўміручая карціна
застравае ў галаве.

## НЕСПАКОЙ

Мне страшна,
што настане лістапад
і з‘явіцца нарэшце
снег малочны,

збяднее на лістоту
мокры сад,
і кволая зямля
самлее ноччу.

Мне страшна,
што калючыя вятры
збягуцца з хмарай
на сівых аблоках

і перакуляць неба
дагары
чарнюткай ноччу
і сцюдзёным змрокам.

І ў гэты час
з-пад поўневай парчы
мне б запаліць
магутнае свяціла,

каб праз хвіліну
дзень знайшоў ключы
ад брамы залатога
небасхілу.

* * *

Падае снег на пялёсткі вяргіняў.
Фарбы ахутала шэрань-імгла.
Іх прыгажосць скамянелая гіне...
Ім — не хапае цяпла..

* * *

Па шэрым небе плылі
з мокрага снегу брылі...

А дрэвы стаялі ў лістоце.
Хацелася крыкнуць «Хопіць!»

снегу, які ляцеў
на рукі зялёныя дрэў.

І бачна было, як стыне
кроў і душа вяргіняў,

якія кастрычнік грэлі,
прыгожым агнём гарэлі!

Па шэрым небе плылі
з мокрага снегу брылі.

* * *

Невядомы, пустынны край —
далягляд сустракае цемрай.
Знічку я прашу: «Не ўмірай!..
Ты жывеш, як і я, недарэмна».

Сціхла лета на нейкі міг,
паляглі і паснулі травы,
і сярод верасовых адліг
прабіваецца месяц жвавы.

Ну спытай жа, чаго не сплю?..
Не магчыма на гэтых хвалях
сном злучыць процілегласць сваю
раўнавагай на зорных шалях.

* * *

Там, за брамай, — вышыня
ў жураўлінай далі.
Ходзіць сумна ваўчаня
па сузор'і шаляў.

Адзінокі сярод зор
у смузе блакіту
чалавек такі ж, як воўк,
гне ў дугу арбіту.

Хоць — блакіт, а хоць — зямля!
Ён у захапленні
пражыве ці не ўдвая
кожнае імгненне.

Жорсткасць, шчырасць і агонь,
зменлівая сутнасць.
Можа, будзе куля ў скронь,
можа — круг замкнуты.

Там, за брамай, — вышыня
ў жураўлінай далі.
Ходзіць сумна ваўчаня
па сузор'і шаляў.

## СКАРПІЁН



*Цяжка вырвацца ад болю і тугі.*
*гараваць не дазваляе гонар:*
*я пакіну смерці ланцугі —*
*і ствару сузор‘е Скарпіёна.*

## ДУХ ЗМРОКУ

* * *

Нада мной Скарпіён узыходзіць —
сімвал смерці для знаку майго.
З ім у кожным вітаюся годзе,
вось і зараз вітаю яго.

Гэта дзіўна, ды вельмі дарэчы —
палымянасць сышлася з вадой:
тут — вялікая тайна сустрэчы
нежывога з прыродай жывой;

тут — Плутона з падземнага царства
выганяе на шалевы луг
ваяўнічасць імклівага Марса,
замыкаючы восеньскі круг.

* * *

Я прывык паміраць,
прызвычаіўся ціха сыходзіць
да іншых прычын.
І не важна, якая мяжа
перапыніць дарогу.
Я адзін —
абсалютнае мора прасторы ільдзін...
І нічога.

* * *

Вусень шэры ў зялёнай поўсці
перапаўзае маю дарогу...
Шчасце прыкмеціла страшнае штосьці —
перакулілася хутка ў бярлогу.
Цягнецца сумная восень за вусенем,
колер жыцця забірае з пасагу.
Ціха іду ад смяротнага вучня —
да бессмяротнага мага.
Мудрае дзесьці далёка і блізка,
як сівізна на расквечаным балі.
Хто пахіснуўся на выбары слізкім —
той і вярнуўся ў мінулыя далі.
Іду, покуль час не наступіць на карак,
як азірнуся — падкосяцца ногі...
Вусень з туману наклікаў старасць
і абнёс ёй шляхоў разлогі.

* * *

На стромых хвалях барацьбы
мяне пільнуюць віракруты.
Мой кожны крок у сне слабы,
жыццё маё — адны пакуты:

не гнуцца ногі, горкі шлях,
і постаць праглынае цемра...
На яве высвяціўся жах —
і ўжо змагацца з ім дарэмна.

Атрутай поўніцца адчай.
Я вязну ў хвалях пранікнення,
душой абняўшы небакрай
над мяккім словам абуджэння.

* * *

Прабегла кропка чорнага бяздоння,
а дзень вакол, запыленай змяёй,
зганяе пух з расшпіленай далоні
багрыста-сіняй восені маёй.

Святло паўсюль — на пальцах і паліцах.
Усюды — свята, толькі мой настрой
пужліва азіраецца, імчыцца
знарок услед за кропкавай хадой.

Прабегла кропка чорнага бяздоння,
а дзень вакол, запыленай змяёй,
паўзе назад пад захадныя промні,
дзе цішыня стаіць над цішынёй.

* * *

Ціш. Клянецца ў адданасці вечар.
Ноч. Сыходзіць, стаіўшыся, вецер.
Смерць туляецца ўсюды па свеце...
Хаваецца вецер ад смерці.

Яна ж — ані заўтра, ні сёння
не знойдзе яго, не дагоніць.
Разгульвае вецер па свеце!..
І вечнасць, і ветах, верце:
недасягальны вецер для смерці.

* * *

Твар восені глядзіць праз свечкі дрэваў —
неадваротнае яе ідзе ўладанне.
Раскрыжаваўшы казкі існаванне,
узніклі постаці непераможных дэваў.

Прарваўшы круг раскінутага свята,
спачыўшы і вярнуўшыся аднекуль,
праз лёс варожы духа-чалавека
да сэрца цягнуць рукі немаўляты.

Жахлівы і няскончаны зарок.
Зноў на мяне нервовы крыж натрапіў
і кінуў проста ў лапы гвілішапі,
сарваўшы абаронны абразок.

Ланцуг парваў адчайны ўдар пачвары.
Чарнее кроў на досвітку змагання.
Змяшалася смяротнасць з існаваннем —
і вызваленне ўспыхнула на твары.

Жывым пяром ад сонечнага птаха
кранулася і засляпіла вочы
змяяшчым дэвам — немаўлятам ночы,
ператварыўшы дзень-агонь у плаху.

Лязо ў вачах забітага стварэння,
дзе стома неадступнаю магілай
героя паланіла і зваліла
духмяным сном крывавых вымярэнняў.

* * *

Слухай, слухай мяне, падарожны!..
У маім чалавечым жыцці
я такою была непрыгожай,
што хацела са свету пайсці.

Ты не верыш? А выйсце знайшлося:
я губіць не стала сябе,
а разбіла люстэрка са злосці —
і пайшла па разбітым шкле.

Крок зрабіла да чорнай казкі.
Крыж зрывала, заплюшчыўшы вочы.
Бледны твар стаў прыгожай маскай:
я цяпер — каралева ночы.

Я цяпер — месяцовы дух змроку,
ледзяная, не маю сэрца,
як не маю сваёй дарогі,
бо жыццё скрыжавала са смерцю.

Бачыш: кроўю напоўнены чашы —
не цурайся, жаданы госць...
Вып‘ем жа за сустрэчу нашу
і, канешне, — за прыгажосць!

* * *

Мне чорна-белы сніўся сон:
ішла па свеце чорна-белым —
і з кожным крокам рваўся стогн
з душы пакутна-ашалелай;

ішла па сцежках бліскавіц;
ішла па вуліцы ля дрэваў —

і не жадала ўпасці ніц
у гэтым небе брудна-шэрым...

Не спатыкнуцца ўсё ж змагла
аб думак чорныя каменні,
шукала выйсце з багны зла,
жыццявя губляючы імгненні.

І дыхаць робіцца цяжэй.
І рвецца немы крык адчаю...
Мне б дзверы адчыніць хутчэй,
ды іх ніхто не адчыняе.

Жахлівы скончаны той сон —
я зноўку раніцу адчула...
Каб насамрэч не збыўся ён,
прашу я Бога — Ён пачуе:

«Не дай жа, Божа, у жыцці
мне захлынуцца хваляй шэрай,
ад мовы роднай адысці
і да святога страціць веру...»

* * *

Святы, святы... Свавольны свет!
Не пахавалі слова «вольны»
святлом атручаных манет
і святарамі горкіх войнаў.

Што я кажу? Ды — Божа крый! —
каб чысціню я закранула!
Аднак жа, Божы крыж — не кій...
Не скончан летапіс мінулы.
Я так кажу, бо свет — вар‘ят.

* * *

Неба агарнулася вятрамі,
хмара жабай чорнаю паўзе,
над разрабаванымі дварамі
ліха скача на адной назе.

Завывае воўкам неспадзянка —
у падпаскі нанялася дню,
енчыць і дамы пасе маланкай,
не шкадуе пугі і агню.

Вецер рве прастору дзікім вепрам,
іклы навастрыўшы да жуды,
узрывае земляныя нетры.
каб знайсці і з‘есці жалуды.

Лямантуе гром раскатным басам,
нават стомы на яго няма!..
Так прырода пазлуе да часу —
потым супакоіцца сама.

* * *

Крылы ўзняць, ад зямлі паляцець
мне прапануе вільготная смерць.
Далей, далей, далей!
Прэч ад сівых зямель,
прэч ад пакут і зла
да незямнога святла.

Ціха сысці ў замаркочаным танцы,
каб усміхацца і не вяртацца.
Далей, далей, далей!
Прэч ад сівых зямель,
прэч ад пакут і зла
да незямнога святла.

Люстрам разбіцца ў мільёны асколкаў
і прачынацца з ранішняй зоркай!
Далей, далей, далей!
Прэч ад сівых зямель,
прэч ад пакут і зла
да незямнога святла.

* * *

Недасягальная падзея,
недасягальнае святло,
на сэрцы крохкі пыл чарнее,
туманіць дым сляпое шкло...

І не магу я дакрануцца
да тых нязджэйсненых надзей,
калі, як міны, душы рвуцца
жыццём згаротненых людзей.

* * *

Кастрычнік кій узняў.
Раструшчанае люстра.
Аксепкі, бы пялёсткі Задыяка...
А што вясціў, прыйшоўшы, Заратустра
у процьме-гушчары святога знака?

Хто ёсць такі на свеце чалавечым —
прышэлец, вынаходнік альбо здраднік —
той, хто спаліў асвечаныя свечкі
ля абразоў святога далягляддзя?

Пытанняў не хавай і не шукай адказаў —
настане дзень і ўрэшце прыйдзеш ты,
асуджаны да патаемнай назвы
перапісаць сжаўцелыя лісты.

* * *

Я страціла тое, што мела
і што не належала мне.
Разбітая восень сатлела,
ды тло мяне не кране.

Вясна, адпачыўшы ад працы,
падорыць шчаслівыя сны,
прымусіць над лёсам смяяцца
і крочыць да новай вясны.

* * *

Вада вакол...
Чаму? Не знаю —
мой знак належыць да агню!
А падсвядомасць вымярае
бясконцай думкі глыбіню.

Вада вакол
у сне і ў праўдзе.
І дождж ліе. І я іду.
І ўсе мае пад восень справы
па вушы канулі ў ваду.

Вада вакол...
І холад гідкі —
бяжыць па скуры ручаёк.

Душа, прамоклая
да ніткі,
у пятках ціснецца ў камок.

Вада вакол...
Як мне нямілы
надвор‘е, хмары,
шэры дзень...
Хачу, каб сонца запаліла
ну хоць
які-небудзь прамень!

* * *

Хілю галаву да абшыўкі вагона,
цягнік трасецца, і думаю я:
«Яшчэ скалыне так —
і будзе гузак!
Будзе напэўна, а мне — усё роўна...»

Сяджу ў цягніку і хілю галаву:
недзе, нідзе ці над вомiркам сонным,
ці то — я шчасце былое заву,
ці — галава мая яблыкам-поўняй
з рэек ляціць на траву...

* * *

Што круцішся, засмажаная восень,
дажджом палітая, бы курыца алеем?
Паклікала зіма мароз у госці,
каб зведаць з ім твае ўсе прывілеі:
дажджом упіцца да хмяльной халеры,
патаньчыць ноччу на скаваным брудзе

і здзейсніць забаронныя намеры,
кастрычнік апрануўшы, нібы студзень!
На дзёрзкай коўдры з шэрані і снегу
перакуліцца, кінуцца ў абдымкі,
і пацалунак падарыць з разбегу,
пяшчоту раскідаўшы па ільдзінках!

* * *

Я толькі што перавяла гадзіннік —
на вуліцу амаль прыйшла зіма.
І сочыць месяц
круглым вокам пільна:
«Ці можа тое быць, чаго няма?»
Не ўцяміць, не, дзіця матулі-ночы,
а я — пераканалася сама:
як не лупі, браток,
на цемру вочы,
бы — штосьці ёсць,
а ўбачыць — сіл няма.

* * *

Казка празрыстай рукой
мой адчыніла пакой —
і мільгануў у вачах
ценем спалены шлях.

* * *

Vita combusta

Як хутка боль прыйшоў
і холадам абвіўся
вакол маіх грахоў,
вакол маёй душы.

З мінулага ляціць
па небе калясніца
з разбураных мастоў
у сонечнай іржы.

Ляціць вакол магіл
спалоханага шчасця,
нясецца пад адхон,
мінуючы мяжу...

На тысячу званоў
апошняга «бывайце»
разбіўся фаэтон
у паласе дажджу.

* * *

Зачынены дзверы. Зачынены вокны.
Зачынена сэрца... Спакой.
А побач — нікога. І думкі — ніводнай
не маю цяпер пад рукой.
Маё каралеўства, дзе мёртвыя слугі,
заснуўшая варта стаіць на пасту.
Там кожны мой крок удараецца пугай,
напружаным джалам ідзе ў пустату.

* * *

Калі ноч сыходзіць па лесвіцы доўгай,
зямля спачывае пад зоркавай коўдрай,
я сумны агеньчык палю ля дзвярэй
і моўчкі чакаю чароўных гасцей.

Прыходзяць з нябёсаў нязбытныя мары.
Нячутныя сны абжываюць абшары.
Ляцяць сярод цемры з легенд кажаны
і полымя крыламі рэжуць яны.

Аж покуль не скончыцца полымя танец
і зоры не згаснуць, і сонца не ўстане —
сядзім, п‘ем гарбату і дзеі глядзім,
што бачацца лёгка праз казачны дым.

## ГОРАД

Пад тоўшчай пяску залатога
жыве таяміца адвеку,
жыве старадаўняя сведка,
вялікая сведка былога.

Праслаўлены горад калісьці,
цяпер не вядомы нікому,
узведзены продкамі помнік
і, можа, падказка да выйсця.

Хавае свае таямніцы
і сёння, маўклівы да часу,
закладзены дзіўнаю расай
як першая ў свеце сталіца.

І час, што імкнецца па колах,
заверне сюды, у пустыню,
закляцце магутнае здыме,
забытае злучыцца з новым.

Дагэтуль пад тоўшчай пясчанай
жыве таямніца адвеку,
жыве стардаўняя сведка,
чакае падзей незвычайных.

## СМЕРЦЬ

Пялёсткі начнога святла
раскіданы па небасхіле.
Я крохкія крылы ўзняла,
бязгучна ў палёце застыла.

Я — светлая здань уначы.
Я — сутнасць бязгучных крокаў.
Я — сувязь усіх прычын,
якіх не адчуеш зрокам.

Не, я — не прывід з касой
і не драпежнік сквапны.
Я ўсім дарую спакой
і шчасця няшчасным прагну.

І я — не жадаю зла.
І я — асушаю слёзы.
І я — дзеля ўсіх адна...
Толькі прыходжу розна.

## ЧОРТ

Сёння ва ўладзе
стыхій чатырох
чорту ламаю
закручаны рог.
Ірву не на жарты,
як з глебы асот...
Енчыць і плача
пакрыўджаны чорт.
З кіпцямі пальцы
сціскае ў кулак,
голаў хавае
пад цёплы каўпак.
Пысу скрывіўшы,
пачаў дыялог:
— Чуеш, дзяўчына,
вярні мне мой рог!
— Не, не аддам,
ты нічога і так,
вельмі да твару
чырвоны гузак.
Ён падыходзіць
табе да вачэй,
толькі вось чуб
пафарбуй паярчэй!
— Я — фарбавацца?!.
Ці я ідыёт?
Я ж не чарціха,
здаецца, а — чорт...
Чорт з гэтым рогам,
як трэба — бяры... —
Бэцнуў хвастом
і схаваўся ў віры.

* * *

Словы блытаюцца па пальцах,
вышываюць узор на пяльцах.
Голка шпарка паперу коле,
пасыпае клубок дробнай соллю.
Разматаліся гукі нітак,
запаўняюць узорам сшытак!

* * *

Я званочкам пазваніла
на лузе, на полі,
матылёчка паланіла —
пазбавіла волі!

Ты, прыгожы матылёчак,
кветачак крылаты,
надзявай мой абручочак
і хадзем дахаты.

Пацалункам, пачастункам
цябе зачарую
і пайсці да мяне ў сваты
хутка накірую.

Ажаніўся матылёчак
са мной, гарнай дзеўкай...
А чаго ж яшчэ ты хочаш?
А куды б ты дзеўся?

Палятаў па кветках, мілы,
палятаў — і хопіць:
цябе ружа паланіла,
дык трымайся, хлопец!

## ПЯРЭВАРАЦЕНЬ

Вочы жывёліны, дзіўныя, сумныя —
дзікае вогнішча жоўтага зла,
адкрыты пагляд і думкі разумныя...
Ну, падыходзь да мяне, ваўкалак!

Чорная постаць, бы з цемры адлітая,
пояс ільняны здымаю з сябе,
кожны вузельчык завязан з малітваю,
зверу надзену — канец варажбе!

Скура спаўзае, расстаяла поўня,
Змена аблічча, свабода і боль...
Вось, чалавек, табе — шчасце і воля,
з гэтым навек заставайся сабой!

## КЫХ

Прывітанне, сябру даўні!
Рада бачыць зноў цябе,
мой стары ахоўнік тайны —
ці то ў шчасці, ці ў журбе.

Як раней — істота лесу.
Як раней — жывеш у пні.
І насуперак прагрэсу
зноў чаруеш на агні.

Зноў лунае ў дрэвах песня
гімнам казачных істот —
адгукаецца на ўзлессі
забалочаны чарот.

Сябра рэха, сябра гукаў —
абсалютны зрок і слых,
ну, хадзі хутчэй на ручкі,
мой музыка — гномік Кых!

## ДРАКОН

Ёсць казкі, легенды, паданні.
За шэрагам сухмарных скал
дракон — бессмяротны выгнаннік —
свабоднай гадзіны чакаў.

Каменныя глыбы стварылі
глыбокі калодзеж і вал,
дракон бессмяротнасць на крылы
хацеў абмяняць — і змяняў.

Узняўся высока-высока
над пікамі снежнай гары,
а свет ні на мала — на многа
змяніўся з далёкай пары.

І людзі пабачылі дзіва...
Цікаўная злоба людзей
на волі дракона згубіла —
ён вечнасць аддаў за яе.

## ДЖЫН

Я — раб кавалка гліны
больш ста гадоў і дзён...
Вось так, бясслаўна, джына
трымае злы праклён:

«Хто мне падорыць волю —
я расплачуся з ім:
ён будзе бажаволіць
над золатам маім».
Я — раб кавалка гліны
пяцьсот гадоў і дзён...
Вось так, бясслаўна, джына
трымае злы праклён:
«Хварэю цягам часу,
аб сценку б‘юся лбом,
я згодны і няшчасным
быць тваім рабом».
Я — раб кавалка гліны
бясконцыя гады,
сціраюцца ўспаміны,
як на пяску сляды...
«Я смерцю пакараю,
хто разаб‘е праклён,
за тое, што чакаю,
ды ўсё далёка ён».
Мяне ўжо вызваляюць,
я чую ўсплёск вясла...
Ну што — перамагае
дабро над сілай зла?

## БЕЛАЯ ЖАНЧЫНА

Злавесная фея вялікага ўзгорку,
не клікай мяне да сябе,
бо я застаюся пад радаснай зоркай
і ведаю тайны твае.

Ты — сочыш у цемры, глядзіш асцярожна,
ты — вабіш людзей да пячор.

І знікне навечна ў іх падарожны
пад змрочным скляпеннем гор.

Калі б да вяршыні дайсці давялося —
у момант гукання савы
пачуюцца стогны і лямант-галоссе,
што з раніцай станеш сівы.

Злавесная фея, вярніся дадому,
у глебу пусці карані,
зрабіся бярозкаю, елкай ці клёнам,
ад дзікага зла адпачні.

## ВАДЗЯНІК

Чорны лес ля старога млыну.
Поўня гойдаецца ў віры.
З-пад вады, агарнуўшыся цінай,
падымаецца ціха стары.

Аглядаецца пільна навокал.
Прыслухоўваецца да вады.
Праплывае над жоўтым вокам
і нарэшце плыве сюды.

Вадзянік ад мяне зусім блізка —
я хаваюся за чарот.
Ён самовыя вусы сціснуў —
і заплакаў, бы кліча каго...

Павярнуўся — і кінуўся ў хвалю.
І з вачэй маіх тут жа знік...
Я з палёгкаю ўзрушна ўздыхаю:
«Во — спалохаўся вадзянік!..»

## СТРАЛЕЦ



*Калі палымяная частка істоты*
*руйнуецца, рвецца, што нават шкада,*
*я ведаю — гэта не варта турботаў:*
*адно толькі ёсць — сцеражыся ільда!*

## МАГІЧНЫ ВІХОР

### КЕНТАЎР

Калісьці кентаўр
прыбіў капытом
кветку маю!
Нямею і з гневам
у кузню іду,
і стрэлы кую.
І круцяцца думкі
молату ў такт:
знішчаю каня —
адбываецца мат.
Каму?
Не буду знішчаць
баявога каня:
сягоння — на троне,
а заўтра ў баях!
Не гэткую казку
спявае баян...
Чаго ж гэта ў кузні
раблю тады я?..

* * *

Я лячу ў цішыні над зямлёй
сярод воблачных крыг,
быццам — дух, быццам — вой.

Ад самоты ўцякаю сваёй,
разважаючы ўслых:
«Чалавек не ўмее лятаць —
каменем падае ён з гары.
Мусіць і заміраць, і дрыжаць,
азірацца і — жыць да пары...»

* * *

На яркіх пялёстках — снег прылёг.
Агняныя кветкі бачны здалёк.
Змоўк знежывела зялёны сад...
І — снегапад,
    снегапад!

Прырода жадала пусціць цяпло,
якое каб за дажджом уцякло.
Люты паклікала біцца ўнакат —
за снегапад,
    за снегапад!

Восень і горыч разам са мной
рукі халодзяць кропляй шкляной.
Цёмны яны пачынаюць абрад —
пад снегапад,
    пад снегапад!

* * *

Я дома зусім адна...
І толькі ў гаротных думках
з гаротай вып‘ю віна
і запішу на гаротны рахунак.

Я іду праз светлую ноч
у свет ідэалу і тлуму.
Я іду. І куды не кроч —
не ратуе нішто ад суму.

Хай мяне пакінуць адну —
я прачнуся ад прагі сэнсу.
Ахвяруючы горыч сну,
я пайду па загаду сэрца.

І не трэба мяне разумець.
І навошта на свеце гэтым
вечна агню гарэць
каля мёртвага сэрца?

* * *

Надакучыла зіма,
што яшчэ не пачалася.
Я пад снегам дацямна
цэлы дзень шукала шчасця.

Мой кваточны паўсядзён
слёзнай восенню прасіла
не знікаць, ды згінуў ён...
Знік — і ўсё! І збоку — вілы!

У буслінай чарадзе
згаслі цёплыя выявы:
не магу знайсці нідзе —
пахаваў іх кот бялявы.

У мароза, бы з агню,
кіпці вострыя балюча
кветны край і цішыню
разадралі на анучы.

Рэкі-шклянкі — у труне,
нібы сонныя царыцы,
толькі дзесьці, аж на дне,
штось жывое варушыцца.

І я потым напішу,
як вясна блакітнай стужкай
падпаўзе — і ледзяшу
зломіць голкавае вушка.

* * *

Срэбныя ніці зрываюцца ціха —
змёрзлы кірунак сусветнага ліха:
вые мяцеліца, золатам blішча,
вечар зімовы ў калядным абліччы.
Дзіркі на небе, прабітыя стрэлам.
Зорныя космы пакутна-ссівелай
казкай халоднай, у шоргаце снегу,
вуснамі мёртвымі ўпіліся ў глебу...
Чорная ноч паглынае наўколле.
Чорная воля, калючая воля.

* * *

Завялі пад дажджом вяргіні.
Згарэла восень. Лістапад.
Вакол жыцця майго — пустыня,
дарэшты спасцігае ад.

І вее смерцю — ад каменняў.
І вее смерцю — ад людзей.
І перайма льнасць пакаленняў
увосень бачыцца ярчэй.

Адны — пайшлі. Другія — будуць.
А ненароджаных — міне
жыцця і лёсу поўны кубак,
і смерць у белай сутане.

Прырода мрэ... Аддаўшы зброю,
стаіць разгублены прасцяг,
разбіты снегавой пароюю,
і не скараецца ніяк.

Зіма вільготная, з марозам,
калючым джалам жжэ зямлю,
і засынае пад наркозам
зямля... Ды толькі я не сплю.

Вакол мяне — адно пустыня.
Адкуль яна ў жыцці маім?..
Там засынае ранак сіні,
а мне... Мне сну няма зусім.

* * *

— Спыніся і скажы
хоць слова! —
Сказала я сама сабе.
Сярод людзей мая замова
не загучыць, не прападзе.
Сярод людзей не выпадкова
замоў не буду гаварыць...
Нашто шчасліваму часова
імкнуцца вечна шчасным быць?

* * *

Снег. Зіма. Праз месяц — Новы год.
Мяккая, шурпатая дарога.
Цеплыня ляціць наадварот:
ад зімы — да летняга парога.

Лёгка. Цёмна, Карацеюць дні.
Прарастаюць снежныя пасевы.
Выступае ў белай цішныі
казка звечарэлай каралевай.

* * *

Зольна восень шуміць
над пустымі лугамі.
Нітка зорак дрыжыць
пад маімі нагамі.

Вецер збіўся з дарогі
на гэтым бязмежжы.
Я гляджу — на дарозе
задумаўся снежань.

Небакрай зацягнуўся
спакуслівай хмарай.
Марна льюцца агні,
дні губляюцца марна.

Я чакаю вясны,
засынаючы раннем.
Паляўнічы кентаўр
распачаў паляванне.

* * *

Нікому не магу
  я падарыць натхненне.
Так, з мараю маёй
  не згаварыўся лёс.
Хацелася б, каб быў
  са мною побач геній,
хоць некалькі хвілін
  за ўсё маё жыццё.
Падзелены, на жаль,
  мы рознымі вякамі.
І час яго прайшоў,
  як не было мяне.
На сто гадоў назад
  я адашлю каханне,
як мёртвай зоркі след —
  нязгаслы шле прамень.

* * *

Не трэба глыбіць раны
па меншай меры адразу,
калі душа надарвана
адной неразумнаю фразай.

Ніякага сэнсу ў вершы —
і ён падаецца шэрым,
можа быць толькі знешне,
толькі пад тон паперы.

А раны — зацягваюць мары,
і час, і сябры, і ўдача...
У нетрах жывой імшары
гіне, што нешта значыць.

І мне ўжо не трэба сёння
таго, што жадала ўчора.
А заўтра — іншае згоніць
мае пустыя дакоры.

* * *

Мне ў гэту ноч
прысніўся сон —
душу мне ён
ускалыхнуў,
і думкі трапілі ў палон
да сённяшняга сну.

Як мне даведацца:
аб чым
павінен ён сказаць,
хто хоча
спосабам такім
мне нешта падказаць?

Я зноў і зноў
шукаю сэнс...
Адно толькі няўцям:
навошта ён
прысніўся мне?..
Які чакаць працяг?

Не буду болей
думаць я
пра гэты сон зусім,
бо час рассудзіць—
давяраць
ці не
мне снам сваім.

* * *

Грэх вялікі шкадаваць сябе —
цяжкасці і боль такая плата...
А з жыцця твайго ляцяць буслы
супакоіць клёкатам над хатай.

Не паспеў, не здзейсніў, не згарэў —
мозг пераплятае павуцінай...
Вечар. Заганяе бабка ў хлеў
з луга паслухмяную скаціну.

* * *

Я ведаю, болей не будзе такога,
дзе я — маладая, высокія словы,
у шклянцы гарбата ад восеньскай ночы...
Такое бывае толькі аднойчы.

Спакойна і цёпла, і сцішыўся вецер.
Маланкамі думкі плывуць у вандроўку.
Душа раскрываецца ў бабіным леце.
І восень здаецца мне школьнай сяброўкай.

Зіма. Пра яе не захочацца думаць.
Ёсць час — ён паможа: сцюдзёнае згіне.
А восень ласкаваю, мяккаю пумай
клубком залацістым ляжыць ля каміна.

* * *

Хтосьці кропку паставіў сёння
і старонку перагарнуў...
Затрымаўся час на паўтоне
і ў бяссонні маім патануў.

Я цяпер не зламаю стрэлак
і гадзіннік перавяду:
пачалося што ў панядзелак —
мае скончыцца ў сераду.

Не сябруе з вераснем снежань,
восень зімніх вятроў не міне.
Мне цяпер і горка, і смешна:
як бы нешта згарэла ўва мне.

Знік апошні лісток на клёне,
што галінкаю біўся ў акно...
Хтосьці кропку паставіў сёння,
а над чым — мне ўжо ўсё адно.

* * *

Я на гранітнай хвалі сну
сама сабе дару вясну.
З цудоўных мар, з далёкіх мрой
сама сабе твару настрой.
На яве да старога ўслед —
і я прыйшла на гэты свет.
І ў час бяды, і ў шчасця міг
не трэба мне быць удваіх...
На мне пачатак дзён закрыт:
сама — сусвет, сама — нябыт.

## КАЗЯРОГ



*Сышла каралеўская ночка —*
*і раптам стаў змрок залатым...*
*Глытае калядны вяночак*
*агонь праз заснежаны дым.*

# КАЛЯДЫ

* * *

Сумны аскет прыйшоў на зямлю —
чорная вопратка, белыя крылы.
Снегам шурпатым засеяў раллю,
стомлена глянуў на белыя схілы.

У задуменні дасяг ён мяжы.
Сэрцам даруе само існаванне
свету, схаванаму шчасцем ілжы,
подзвігам самазаклання.

Дзіўны пустэльнік з блакітных дарог
шчасце стварае праз смерць і пакуты.
Зноў ахвяруе сабой Казярог
на берагах абсалюта.

* * *

Час... Яго не ашукаеш.
І спрачацца з ім не будзеш —
перакуліць нечакана,
узгарачыць і астудзіць.

Ні да лета, ні да шчасця,
ні да зробленых памылак
не дазволіць час вяртацца
неадоленаю сілай.

Час... Тры літары і — бездань,
рух, уздзеянне, прычына,
найкаштоўнейшая бесцань,
першаіснасная гліна.

* * *

Усім адмераны свае кавалкі часу,
і думкі гонару не могуць перашкодзіць
жыццю, сышоўшаму з палетак, згаснуць,
законы пераправіўшы ў прыродзе.

А там, яшчэ не ўмерлая, істота
вякі назад кагосьці звала палка...
У вечнае з таго зляцелі ноты,
памножыўшы кавалкі на кавалкі.

* * *

Спакой, выгнанне, роўны шлях —
як на далоні — бледна-сіні,
і нітка срэбра па краях
павольна цягнецца і гіне.

А за гарою — ноч жыве,
адна, а побач — толькі страта.
Яна ўдава, а лес ўдаве —
пасе і песціць зорны статак.

Спакой, выгнанне, горды міг...
Іду за чыстаю ўдавою.
Мой цень спыніўся і прынік
да светлай ночкі галавою.

* * *

Неўміручы анёл Беларусі,
разгарні свае белыя крылы,
ахіні мае кволыя плечы!..
Я табе і зямлі пакланюся,
запалю па-над дрэвамі свечкі,
да аблокаў рукой дакрануся
ў спадзяванні, самоце і скрусе...
Падары мне ратунак і сілы!

* * *

Хваравітае адценне —
колер змрочнае вандроўкі,
час адхлання, час зацьмення,
час маёй крывавай зоркі.

Не гляджу на белы свет,
дзе спакой не зведаў волі,
дзе няма прыстаўкі «не»
і не будзе ўжо ніколі.

* * *

Рукі б запусціць у тваe косы,
разбурыць прычоску, каб ізноў
ветрам падхапіць сцюдзёны россып
іскрамётных мяккіх валасоў.

Прывязаць вузлом тугой завеі
да апошніх дзён календара...
Снежная, халодная лілея —
мілая змовая пара.

* * *

Зіма, халодная імжа,
дарогі коўзкая мяжа.
Чарнюткі лес з-пад шэрых хмар
і лёдам сціснуты ліхтар —
жывуць у сне пра лёд і снег,
пра край халодны, пра мяне,
пра месяцовы медальён,
пра запавет мінулых дзён.

А з тых часоў, якіх няма,
мне захавалася зіма.

* * *

Засыпана ўсё белым пылам.
І я — побач з гэтым змяркannem
стаяла над гэтай магілай
і тут сустракалася з раннем.

Сыходзілі сумныя мроі —
крылатага неба стварэнні —
і плакалі разам са мною,
і падалі ніц на калені.

Прасілі аб літасці Бога,
прасілі грахоў пазбаўлення,
прасілі хвіліну зямнога —
і гінулі ў зорным ірдзенні.

Я крыж назіраю за хмарай,
а сэрца зрываецца болем:
якою нябёснаю карай
скапычана гэтае поле?

Калісьці была тут магіла,
парослая дзёранам горкім,
а зараз — засыпаны пылам
зямля і змярцьвелыя зоркі.

* * *

Пры дарозе — касцёл,
таямніча-суровы
прытулак для вернікаў шчырых.
А на браме яго —
дзіўны сімвал,
што да сэрца майго прыхінуўся
з дзяцінства.
І я сёння
яго не забыла,
і ўжо не забуду ніколі.
Гэта — вока,
так, трэцяе вока.
У праменьчыках сонца,
у агні трохвугольным —
мой сімвал.
І сімвал, як бачу, касцёла —
прытулку для вернікаў шчырых
крыві каталіцкай.
Я ж —
іду да царквы праваслаўнай.

* * *

Выклік да года старога —
да новага шчасця ў шлях!
Хопіць з мяне трывогі:
як не крычы да знямогі —
сэрца знямела ў грудзях.

Мой прыгавор, бясспрэчна,
дробны малюнак... Кроў
нераз‘яднанай сустрэчы —
сёння яшчэ не вечар —
сэрца пусціць наноў.

* * *

У запылены храм прыйшла —
промні шыюцца ў кут імгляны,
ценем б‘ецца з празрыстага шкла
знак мінуўшчыны — колер ільняны.

Тут стагоддзяў нязменны лад.
Пыл і сонца. Спыніўся час.
Відавочна — жывы заняпад.
Бессмяротна-нябачны сказ.

Дзіўны храм, некрануты нікім,
слова мудрае затаіўшы,
пакрывалам накрыты сівым, —
сам сабе адгукаецца цішшу.

* * *

Скрозь цень дрыготкіх успамінаў
святло ліецца на далоні.
І я жыву ў глухім палоне —
у Лету рэчаіснасць кіну.

Я не магу кранувца пылу,
што знік, стагоддзі пахаваўшы,
маёй душы падараваўшы
жыццядайныя крылы.

Мне ўжо далей балюча крочыць:
хто зразумее — дапаможа.
А я — адно малюся: — Божа,
схавай у сонцы чэрствасць ночы
і зноў пашлі нам дабрасвет!

## МАЛІТВА

Дзева Марыя, Ісусе Хрысце,
Бог, Дух Святы і Святыя ўсе!
Дапамажыце! Я ў ночы і ў дзень —
буду імкнуцца жыць для людзей.
Абараніце ад ворага злога,
ад злога дзеяння, ад злога слова,
хваробаў пакутных, насланняў і чараў,
ад вока дурнога, звыродных з‘яваў...
Хай гора не ўбачу, хай сціхне трывога —
я ў сэрцы надзеі прынесла ад Бога.

* * *

Ад пятлі ў пятлю свайго блукання
ўецца час, закрэслівае словы.
Толькі тут не клалася змярканне
на перапісанае нанова.

Можа, кропка ёсць адна на свеце —
існуе, бы яркі стрыжань-сувязь,
на які гады кладуць адзенне,
да якой зняволена іду я.

І, прыйшоўшы, сумна назіраю:
глыбіня празрыстая — далёка,

падыходзіць з памятнага краю
да мяне ад сённяшніх вытокаў.

Ад пятлі ў пятлю працягне ніці
літасць-час, загоіць мае раны...
Памяць пабялела — не баліць ёй,
а душа — праз лекі пакарана.

* * *

Паеду... Паеду дамоў —
там мае родныя людзі.
Павагу да іх і любоў
ніякі мароз не астудзіць.

Чакае мяне мой дом
і навагодняе свята...
Там ёлка гарыць агнём
і казка льецца ў гарбату.

* * *

Новы год кладзе на сані
пачастункі, пажаданні.
Мне ж пашчасціла нагодна
перадаць падтрымку года.

Так на кожную пару
пажаданні паўтару:
каб вясной шчаслівай доляй
засявалі грады, поле;

днём шчаслівым і заможным,
каб збіралі ўлетку збожжа;

увосень — ладзілі вяселлі;
і зімой каб радасць мелі;

каб на стол маглі пакласці
мех удач, кавалак шчасця;
каб жылі, як каралі,
і ўсе здаровыя былі!

* * *

На казачнай арбіце
сагрэўся Новы год.
У золкавым блакіце
сканаў сонцазварот.
Акрыўся чорнай хмарай —
мой горад ноччу спіць.
Затушаным пажарам
ліхтар на дне гарыць.
Цячэ рака праз вулкі —
вада нясе цяплынь,
і рэхам б‘ецца гулкім
аб стрэхі мрояў плынь.
Начныя забабоны
і мой чужы пагляд
шукаюць абароны
ў дасведчаных каляд.

* * *

Далоў спакой — мне б шчасця трошкі.
Пашлі, мароз, шчаслівы год!..
І я лічу са смехам дошкі,
рукамі абхапіўшы плот.

Пад вокны збегліся дзяўчаты —
стаяць і слухаюць пра што
гамоняць людзі за гарбатай,
на кухні седзячы гуртом.

— А вам падслухваць, як не сорам! —
кідаюць хлопцы ў дзевак снег.
І ўсе смяюцца дружным хорам,
і рэха паўтарае смех!

* * *

Не, не кажы... Я зусім не вядзьмарка,
але, калі хочаш, павараджу.
Да левай рукі адгарні тры карты.
Вось так... А цяпер — я на іх пагляджу.
Твае думкі разбегліся, думай уважна.
Давай, засяродзься на чымсьці адным.
Ну — дзіва! Няўжо табе жудасна-страшна?
Баішся ты праўды, баішся маны!
Вунь, першая карта — мінулага сведка,
трынаццаты нумар, дзе баба з касой...
Не кажа яна аб раптоўнай смерці —
ты проста калісьці згубіла спакой.
Спазнілася карта сваёй засцярогай —
і сённяшні вынік не зменшыш ніяк.
Пытайся парады ў Тара старога
і карту-ратунак кладзі ў Задыяк.
Відаць, ты — асоба, і моцная духам.
І сувязь магічная зараз з табой!
Усё выпраўляецца толькі праз згубу,
але перамога з тваёю рукой.
Карта апошняя — вынік разумны,
цікавая рознасць на будучы лад...
Апошняя карта — кола фартуны,
трымайся на ім і — ні кроку назад.

* * *

Пра што пісаць? Мне нават
ужо і сны не сняцца...
У вечарок калядны
з‘явіўся слаўны лёс.
І я спачну пад коўдрай
на сонечнай паляне,
схапіўшы птушку-шчасце
за каляровы хвост.

* * *

Над далонню чалавечай,
па-над вокнамі пустымі
льюцца зоркі шляхам млечным
разам з думкамі маімі.

Сярод попелу і хламу —
і вусцішна, і няўцешна.
Па разбуранаму храму
я адна іду няспешна.

Свет былога пакалення
паўз нябёсы пралягае.
Зорны крыж майго натхнення
мне пакуты пасылае.

Час, як покліч жураўліны,
не вяртаецца аднойчы
ні ў секунды, ні ў хвіліны —
адзіноцтва сярод ночы.

## ВАДАЛЕЙ



*Сёння вянчаю слова «апошні».*
*З промнямі сонца высыпаў снег.*
*Месяц чароўны, месяц раскошны*
*скончыўся ноччу і далей пабег.*

# ТЫСЯЧАГОДДЗЕ

* * *

Дзе срэбныя рукі крыніцы жывой,
дзе мёртвы ручай спасцігае надзею,
у вецер свабоды нырну з галавой
пад зорным агнём Вадалея.

Спыніць немагчыма сыходзячы міг —
наступнае дадзена зведаць Урану.
Далёкія дзеі ўспрымаю на слых,
абраныя сэнсам без зману.

Паветраны сімвал сцюдзёнай пары —
на плыні халоднай лілея —
сустрэне сузор'е загадкавых Рыб,
што зменяць палёт Вадалея.

* * *

Дзе мая Віктарыянская эпоха?
Мне сустрэць яе не падфарціла.
Дваццаць першы век ідзе патроху,
а дваццаты — сунецца ў магілу.

Я за імі ледзьве паспяваю...
За плячыма — пераменаў горы:
у рукзак іх кідаю бадзёра
і тысячагоддзе адчыняю.

* * *

Аловак у руцэ —
  і край зямны на небе,
знясілены спакой
  разгорнутага дня:
у захадзе агню
  плыве маўклівы лебедзь —
аблочны пасланец
  у мройных струмянях.
Аловак у руцэ —
  малюе цёмна-сінім:
застылі кроплі зор,
  кідаюць срэбны цень,
спайманыя цяпер
  сусветным павуціннем,
чакаючы, калі
  зноў разгарнецца дзень.

## ЧАС

Там, за люстрам непаўторнасці,
там, у іншай старане,
час, бы шар, рухомы зорамі,
абміне свой рок ці не?

Сутыкнуўся, знік за вечнасцю,
ды не згінуў яго дух:
запаліў ён кроплі млечныя,
скрыжаваўшы лёс і рух.

Гонг ударыў за варотамі,
затрашчала небыццё.
Развітаўся свет з пустотамі —
іх запоўніла жыццё.

* * *

Шукаць спакой у адзіноце —
знайсці, каб разгарнуцца ў ім
і загучаць на срэбнай ноце,
і паляцець на край зямны,

каб цешыцца такой бязмежнай
свабодай лёгкай, маладой,
змагацца за статут належны —
і ўрэшце адшукаць спакой.

* * *

Глыбокі шлях, няроўная пячатка.
Глыбокі след падкрэслены абводкай.
Снег будучы схавае цень нашчадка.
Снег высахлы ляжаў пад ценем продка.

Сучасны снег. Ліхтар з мяне малюе
глыбокі, незавешаны партрэт.
Ці — не... Нашто ізноў сабе маню я?
Тут толькі — контур, пляма, сілуэт.

Няма вачэй і вобразу не будзе —
адбітак, водгук, рэха, цішыня...
Сярэднечассе, вечар, зоры, студзень.
І цень ляжыць на снегавых палях.

* * *

А прыйдзе сон нявіднай парай
і выб‘е звон адным ударам
з маіх вакон на вулкі хмараў!

* * *

Лёгкая хваля,
мокры пясок.
Рух запаволены
цёплым праменнем...
Дзесьці адкрыўся
прастор і вытокі —
рух і мана ідэі.

* * *

Аднойчы сустрэнеш
сябе выпадкова
на цёмнай дарозе
загадкавым ценем

у іншых стагоддзях,
у іншых умовах,
у іншым аблiччы,
у іншых памкненнях.

І як разгадаць,
кім ты быў
з гэтай праўды

і што з ім агульнага
тут засталося?

Кармічныя ніці
звязалі праявы
і, мабыць, пакінулі
важнае штосьці.

Як выкрыць таемнае
з памяці сціплай?
Спыніцца і ўрэшце
зірнуць праз сябе,

былым пранікненнем
і шчырай малітвай,
слязьмі разумення
зайсціся ў мальбе.

* * *

Апанавала
        і адляцела —
душа мая
        пакідае цела.
Сустрэча свету
        з таемным нечым —
на жаль, апошняя
        мая сустрэча.
Час набліжае
        прывід далёкі,
заплюшчыў вочы —
        пабег наўцёкі.
Былы сусвет,
        што магутны сілай,

з шасці праклёнаў
    ідзе ў магілу.
А за спіною —
    і рай, і пекла,
адлюстраванне
    пад небам бледным.

* * *

Мне павольна ляцець у бялюткіх снягах,
поруч белы мядзведзь разгарнуў зорны шлях.
Сеў за чысты абрус, хлебануў малака,
месяцовы гарбуз напаткаў едака.
Так пад раніцу мяккага сонца раса
будзе семкі сушыць ад таго гарбуза.

## РЫБЫ



*Як дарэчы вясна!*
*Я чую яе ходу.*
*вітаю яе ваду,*
*па сцежках яе іду...*
*Як дарэчы вясна!*

## ПА РУСАЛЬНЫХ СЛЯДАХ

* * *

Пад вадой — мармуровы дыван.
Я голаў кладу на поўнач,
а нада мной — акіян,
а з ім — нептуновая поўня.

Дзве рыбы спляліся. Рушнік
хвасты завязаў ім навечна.
Плывуць сярод думак спрэчных —
з лютага ў сакавік.

Пад вадой — мармуровы дыван.
Я голаў кладу на поўдзень.
Сышоў ад мяне акіян,
а з ім — нептуновая поўня.

* * *

Я ў сне палячу да вытокаў,
да краіны маёй сінявокай,
каб прыпасці да чыстай крыніцы,
каб стагоддзям сівым пакланіцца.
Каб убачыць засланыя далі,
каб адчуць, што мяне тут чакалі,
каб зайсціся сцюдзёным паветрам,
свой спакой зразумець — і памерці.

* * *

Штосьці здзейсніцца хай на дне ракі...
Праплыве мой край белым воблакам.
Павярнулася я на ўсе бакі,
каб пайсці хутчэй над дарогаю.

Я стамілася і не бачу сноў.
Ад вады смуга росна сцелецца.
Прычараваны, ты пайшоў дамоў,
а любоў мая перамеліцца.

Задуменны крок — ды паўстала даль.
Зразумець цябе не паспела я.
Лёс вядомы твой — ды не мне, на жаль,
выпраўляць яго сілай белаю.

* * *

Што русалка — ведаеш сам:
не ўпарцься — ідзі са мной!
Я ўсе песні табе аддам —
да адной.

Паглядзі ў глыбіню — сады.
Зазірні і ныры ў ваду.
Вельмі проста ісці туды —
адвяду.

Пад магутным дрэвам рачным
пакладу адалень-траву.
Я табе гавару: «Спачні...
Я заву!..»

Там, пад хваляй, жыве спакой.
Ён даўно ўжо чакае нас.

Там спыніўся побач з ракой
час.

Чалавек спачнуў у віры,
а душа — ніяк не засне.
Так і ходзіць яна па старым
дне.

* * *

Цяжкі сон.
          Сотні дум...
Як жа быць мне?
          Хто падкажа?
Што любіць,
          а што зняважыць?
Як развеяць
          гэты сум?

* * *

У бязгучнай цемры золак
прывідам ходзіць каля зорак.

І спаталяе вечны голад —
кусае золак.

І перапоўнены крывёю
аблокаў рэкі.

Нябёсны твар збялеў ад болю,
самкнуў павекі.

І ноч ляціць на паляванне
за жахам свету.

І сцюжа скончыла выгнанне —
халодзіць ветах.

А неба боль перамагае —
адкрыла вока.

І цемра ў сонцы памірае
да часу змроку.

* * *

Сціхла,
спынілася
мяккаю думкай.
Сном вышываным
душу агарнула.
Нешта далёка-далёка
шчымлівае,
нешта далёка-далёка
шчаслівае.
Я разгадала яго
і заснула
сном вышываным,
мяккаю думкай.
Сціхла,
спынілася
сэрца фіялкі.

* * *

Амаль блакітная папера,
бы снег на поўневым акне.
А ў вышыні гарыць Венера,
табой прысвечаная мне.

Не, мне з табой не сустракацца.
Не гаварыць і не пісаць.
Ані ў жыцці, ані ў мастацтве —
не закрануць, не існаваць.

Не ажывіць маўчанне словам.
Не запаліць жыццё наноў.
Іду па крузе выпадковым
да старажытнейшых высноў.

І не звярнуць, і не пакінуць —
спрадвечны шлях паўсюль адзін:
ці вінаваты, ці бязвінны —
зрывайся, плач, але ідзі!

* * *

Цеплынёй напоўню дом,
што стаіць зімой халоднай,
сцеражоны крохкім льдом
пад нашэсцем непагодным.

* * *

Роўна-белы снег запрашае прылегчы.
Цела стомлена хіліцца — толькі б не ўпасці.
Штосьці мякка кранае за плечы...
Шчасце?

Шчасце! Гэй, на бялюткай прасторы
ёсць сцежка.
Не блукай! Ці ты хочаш па новай праклясці
многіх сцежак узоры
на шчасце.

Слабы дотык, хвіліну трымалася лета.
Сёння ўлады не маю яго назаўсёды ўкрасці.
А далёка з зімы адгукаецца шэптам
шчасце.

* * *

Раса... Яе не бывае зімою:
спацелыя вокны — не росныя кроплі.
Жабрачка-завея са срэбнай сумою
па белым полі брыдзе нетаропка.

Халодная панна, танюткая постаць,
чароўнаю зданню прарэзала нетры
начнога прастору, маёй адзіноты
і недзе далёка лунае ў паветры.

Старая жанчына, лагодная пані —
дзве розныя постаці сталі адною.
Ёсць штосьці пачварнае ў гэтым яднанні,
як быццам, усмешка ляціць за труною.

* * *

Не лёгка і не весела
зімоваю парой
спускаецца па лесвіцы
мінулага настрой.
Мой сон скаціўся з восені
ў зімовае акно,
і мара легчы просіцца
на сонечнае дно,
каб жыць пад коркай лёдавай
сярод лянівых рыб,
каб з веснавой прыродаю
пялёскацца ў віры.

* * *

Нахіляецца лістота
цьмяна-дымным пранікненнем.
Гіне роспач і самота —
і бяды кладзецца меней...

Па русальных слядах
не ліецца вада,
адыходзіць бяда
з гукам песні...
Ад істоты маёй
б‘ецца сувязь з зямлёй
і на хвалях рачных
сонца песціць.

* * *

Няхай мой роздум і роспач
растануць, бы след на снезе.
Было б толькі шчасце побач,
а гора — далёка недзе.

Каб свет прастаяў хвіліну
жывы і амаль нерухомы.
Каб боль у святле загінуў
і выйця не стала злому.

* * *

Мой дуб, мой сябра пасінелы
сярод мяцеліцы расце.
Яго суцешу, як умею,
і зноў пакіну ў цемнаце.

Там, за акном зямнога шляху,
сыходзіць поўня ў пэўны час,
каб галаву сваю на плаху
пакласці ўжо ў мільённы раз.

Ды што там неба — пад нагамі
аблокі ў вадзяных плашчах!
Прытомнасць круціцца на грані
ляза іржавага мяча.

Мой сябра дуб, якія сховы
ты затуліў сваім галлём?
Я завітала выпалкова
ў твой наймагічна дзіўны дом.

* * *

Кропля згубілася ў моры.
Зоры забыліся сном.
У нетрах нябёсаў
вандруе Зямля
тысячу дзён.

* * *

За азёрамі, за балотамі,
за шырокімі даляглядамі,
недапісанымі палотнамі
парасла зямля густа лядамі.

Маляўнічымі краявідамі
паўстаюць лясы чараваныя,
перахрышчаныя друідамі,
патаемнай мяжой схаванымі.

* * *

Ізноў няспынныя хвіліны —
уладай ад былых часоў —
нясуць па жылах успамінаў
маю ўзгарачаную кроў.

Яна вяртае праз стагоддзі,
і бачна праз сівыя дні,
як дрэва продкаў узыходзіць,
пускае ў існасць карані.

Узводзіць новыя галіны,
расце праз хвалі новых дзей —

буйнее шчасная расліна
праз лёс народжаных людзей.

Ды смерць — начная каралева —
кладзе жыццё, кладзе гады
на кольцы родавага дрэва...
І прынясе мяне сюды.

* * *

Ад гарачай Чорнай Русі
я прыйшла да белых азёр.
Я прыйшла гэты край прасіць
стаць мне хросным,
бо мой — памёр...
Я прашу: хай яму цяпер
будзе кінуты зорны брас,
няхай ён на зямлю яшчэ
прыйдзе, прыйдзе
ў найлепшы час.
Заблукала яго душа
сярод белых нябёсных крыг.
Я ж — да белага краю прыйшла,
каб мяне ён хрысціў у віры —
у віры святла, чысціні,
у азёрных сваіх струмянях.
Я прыйшла парадніцца з ім.
Я прыйшла, каб абраць імя,
прычасціцца да светлых сіл,
памаліцца да блізкіх зор...
Ад гарачай Чорнай Русі
я прыйшла да белых азёр.

* * *

А мне нялёгка ў гэты час —
перакуліўся дах.
Упаў на плечы і пагас,
як свечка ў галавах.

Адмерла шчырая душа,
замест яе — разлік.
Памёр у цёмных ледзяшах
марозны маладзік.

Бы яшчар, час свой хвост адсёк —
як змей, паўзе на столь.
І адзываецца здалёк
нясцерпным плачам боль.

Балота гасне пада льдом —
перагарэла ніць.
І побач з ім стаіць мой дом.
І цішыня стаіць.

І таямніца. І нуда.
І адваротны лік...
Люструе горкая вада
марозны маладзік.

* * *

А я хачу сысці адсюль
далёка... Ад сябе далёка.
Дзе гора змежыцца на нуль
парадкавага вока.

Дзе шчасце вечнае жыве.
Дзе не магчымы слёзы.
Дзе зоркі коцяць па траве
свой поступ нецвярозы.

Ад тых начных, ажыўшых мрой,
я ўбачу, што зямля
з недасягальнай цеплынёй
патрэбна мне ўдвая.

* * *

Нібы вымерла ўсё вакол —
чую колы свайго цягніка.
Стаў караблік душы на прыкол.
Павярнула назад рака.

Цішыня імчыць на кані.
Гук спазніўся — стаіць, маўчыць.
Я кажу да сябе: «Засні!»
А яна ўсё не спіць, не спіць.

Схамяніся, глядзі — карабель!
На прычале... Бяжы хутчэй!
Вецер-сон залюляе цябе
срэбнай хваляй рачных вачэй.

Засынай жа!.. Засні, засні!
Як заснеш, дык не так баліць...
А яна — мне: «Маўчы, не мані!..»
А яна ўсё не спіць, не спіць.

* * *

Чуецца туга, і далёкі край
набліжаецца меладыйнай тэмай.
Вастрыё душы ўпілося ў асфальт
брудных маставых сонечнай сістэмы.

Поўневы ліхтар, ціха ў гарадку,
а яна — гучыць словам пранікнёным.
Я ўвайду адна ў млечную раку,
вольна паплыву з чорнага палону

далей ад зямлі ў каляровы міг,
дзе спыніўся свет лічбай спраўленай...
Перачытаны сотні зорных кніг
пра тугу маю развітальную.

* * *

Ліецца неба на мяне.
І музыка ліецца.
І я, як быццам у паўсне,
і пад нагамі — сэрца.

Хто мне адчыніць вышыню,
калі закрыю вочы
і далучуся да агню
на павадкавай плошчы?

Свядомасць узрывае столь,
ламае, нібы з цэглы,
маёй душы апошні боль...
І рушыцца адлегласць.



Summa sedes non capit duos...

Змест

**Авен** .......... 4
*Агонь — дзеля агню...* .......... 9
**Цялец** .......... 24
*Квецень* .......... 25
**Блізняты** .......... 35
*Сувязь мяжы...* .......... 36
**Рак** .......... 47
*Месяцовае святло* .......... 48
**Леў** .......... 61
*Вогненная казка* .......... 62
**Дзева** .......... 75
*Зорная панна* .......... 76
**Шалі** .......... 85
*Вяргіні* .......... 86
**Скарпіён** .......... 92
*Дух змроку* .......... 93
**Стралец** .......... 113
*Магічны віхор* .......... 114
**Казярог** .......... 124
*Каляды* .......... 125
**Вадалей** .......... 136
*Тысячагоддзе* .......... 137
**Рыбы** .......... 143
*Па русальных слядах* .......... 144

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Ілона Мікалаеўна Сцяцко

Нябёсныя Карункі

Кніга вершаў

Рэдактар *А. Масарэнка.*
Мастак *У. Панкевіч*
Карэктар *Ж. Яснотка*
Камп'ютэрны набор і вёрстка *Д. Андрэеў*